

*Багамацер Агіасарытыса. Каменная іконка зь менскага Замчышча. Менск, Дзяржаўны Гістарычны Музэй Беларусі*

*«Выдѣвши же преподобная Еуфросиниа монастырь свой украшен, всего блага исполнен, и умысли создати вторую церковь каменную же святѣй Богородици. И тую совершивши, иконома украсиви и освятивши, дасть ю мнихом. И бысть монастырь велик.*

*И видѣвши устоена два монастыря превелика зѣло и пребогата, и рече в себѣ: «Слава тобѣ, божѣ! Слава тобѣ, владыко! Благодарю тя, вышний! Что есми восхотѣла, то, ми еси дал. Скончал еси желание сердца моего, господи» И рече: «Помилуй мя, господи, даруй прошение мое да конца: да бых видѣла пречистую Богородицу Одигитрие в сей церкви!»*

*І посла слугу своего Михаила у Царьград, ко царю, нарицаемому Мануилу, и к патриарху Луцѣ с дары многоцѣнными, просящи от него святѣй Богородици, еже бѣ евангелист Лука написал 3 иконы еще при животѣ святѣй Богородици и постави: едину во Ерусалимѣ, другую во Цариграде, а третюю во Ефесѣ. Она же со тщанием прошаше Ефѣскиа святѣй Богородици. Видѣвши же царь любов яе посла ефесеном 100 оружник своих и принесе святую Богородицу в Царьград.. Патриарх Лука собра епископы и соборы вся во святую Софию и благослови ю, и дасть ю слузѣ преподобныя Еуфросинии. Ю же с радостию приат и принесе госпоже своей Еуфрасинии. Она ж, внесше в церковь святѣй Богородици и постави ю. И воздевши руцѣ, и рече: « Слава ти, господи! Слава тебѣ, еще реку! Слава тобѣ, владыко, сподобивый мя видѣти во днешний день образ пречистыя матери твоея!» И се рекши, украси ю златом и камением многоцѣнным. И устави вся во вторник носити по святым церквам.*

*(«Жыціе Еўфрасіньні Полацкай»)*

*Аб іконе Багамацеры Эфескай у старажытным Полацку, а таксама аб іконе Багамацеры Агіасарытысы чытайце дасьледваньні Васіля Пуцко. б.16-20*

# Polacak

Published with the financial support of the parish Mother of God of Zyrovicy, Cleveland, Ohio, USA.

Друкуецца пры фінансавай дапамозе прыхода Жыровіцкае Божае Маці, Беларускай Аўтакефальнай Праваслаўнай Царквы, г. Кліўленд, штат Агаё.

Рэдакцыйная калегія: **Сьвятлана Белая** (рэдактар), **Міхась Белямук** (сакратар), **Янка Салавянюк**, сябры -- **Сяргей Карніловіч, Іна Каханоўская, Вольга Дубаневіч (МакДэрмат), Лідзія Лазар--Ханенка, Янка Ханенка.**

Editorial board : **Svetlana Belaia** (Editor), **Michael Bielamuk** (Secretary), **Jan Solowienuk**, Members -- **Serge Karnilovich, Ina Kachanovski, Olga Dubanevich (Mc Dermott), Lydia Lazar-Chanenka, Yanka Chanenka.**

Ганаровыя сябры рэдкалегіі:
**Анатоль Белы, Васіль Бықаў, Іосіф Юхо.**

Прозьвішчы падпішчыкаў і ахвярадаўцаў рэдакцыя будзе публікаваць у часопісе.

All correspondence should be addressed to:
S.Belaia or M.Bielamuk,
10915 Lake Rd., Cleveland, Oh. 44102, USA.
Tel. (216) 651-3451

**Сьвятлана Белая.** Аб чым зямля сьпявае....
**Уладзімір Караткевіч**. Цырцовыя цагліны. . . . . . 3
. . . . . . 4

*Наша гісторыя*

**Юры Штыхаў.** Полацкія крывічы. . . . . .
**Сяргей Тарасаў.** Полацкае княства ў XI ст.. . . . . . 5
**Васіль Пуцко.** Аб іконе Багамацеры Эфескай у старажытным Полацку. . . . . . 9
**Сімяон Полацкі**. Прилоѣ. . . . . . 16
**Ларыса Касьцюкавец**. «Полацкі сшытак». . . . . . 21
**Міхась Белямук.** Эмблема на шчыце герба «Пагоня». . . . . . 22
. . . . . . 26

*Памяць зямлі*

**Міхась Белямук**. Лісты ад Міколы Ермаловіча (Заканчэньне). . . . . .
**Успаміны Яўгена Ціхановіча** (Працяг). . . . . . 34
. . . . . . 38

*Роднае слова*

**Янка Юхнавец.** «* * *Зыйшоўшы крокаў некалькі з узгорку...»
Сакратава. . . . . . 44
Хрышчэнцы. . . . . . 45
**Масей Сяднёў**. Маісеевы законы. . . . . . 45
Лесьвіца. . . . . . 46
Божая міласьць. . . . . . 46
Шматстайнасьць. . . . . . 47
Міласэрная Сара. . . . . . 47
**Сьвятлана Белая**. Максімава Яраславія. . . . . . 47
. . . . . . 48

*Чарнобыльскі шлях*

Alexandr Lyutsko. Chernobyl. . . . . .
. . . . . . 54

*Згукі Бацькаўшчыны*

**Сьвятлана Менская**. Татары на зямлі Беларусі. . . . . .
**Людміла Налівайка.** Адраджэнцы «Пагоні». . . . . . 57
**З жыцьця эміграцыі**. . . . . . 59
. . . . . . 62

**Андрэй Карпук.** Мастацкая распрацоўка макета вокладкі, шрыфтоў і заставак рубрык.
**Уладзімір Васюк.** Плякат Ефрасіння Полацкая
**Уладзімір Басалыга.** Спаса-Ефрасіннеўская царква ў Полацку.

На першай бачынцы вокладкі: **Сямён Герус.** Франьцішак Скарына
На чацьвертай бачынцы вокладкі : **Сямён Герус.** Цяжкія ўспаміны

# Аб чым зямля сьпявае...

*Неяк казалі мне ў Полацку:*
*хтосьці сьпявае каля сьвятой Сафіі*
*кожную ноч пасьля Пакровы...*
*У пакроўскую ноч зябкую,*
*пасьля споведзі*
*ў самой Еўфрасіньні*
*выйду я на ледзь бачную сьцежку —*
*да Сафійскага храма.*

*У Барысава камня стану,*
*паслухаю ці зразумею,*
*хто тут сьпявае.*
*Ніколі ня чула я песьні такой:*
*ад яе плача камень Барысаў,*
*крывавіць трава,*
*што мой шлях усьцілае,*
*і чарнее паветра:*
*у ім чуецца водар пажараў.*

*І тады зразумела:*
*то сьпяваюць былыя стагодзьдзі*
*і нашыя продкі,*
*што зямлю сваю ратавалі,*
*што ляглі за яе,*
*каб данесьці нашчадкам*
*гісторыю Полаччыны.*

*Нажаль, прызабытую намі...*

Прызабытую, але, дзякуй Богу, адраджаемую зноў. Бо, як казалі нашыя продкі: «*Не прасі сабе дзён многіх, ні багацьця, ні душ ворагаў тваіх, але прасі сабе мудрасьці і памяці*». А памяць, што прарастала палын-травою праз папялішчы пажарышчаў, што прасачывалася «*людем простым посполитым к пожитку и ко размножениию добрых обычаев*» праз кнігі Скарыны, што дайшла, нягледзячы на ўсе зьнявагі і перашкоды людзкія, вяртае нас у старажытны Полацак, у 1101 год.

Мажліва 880 гадоў назад (так лічаць некаторыя дасьледчыкі) нарадзілася незьвядальная кветка райскага саду, арол, што лунаючы ў небе, праляцеў ад захаду да ўсходу, як промень сонечны, прасьвятліўшы зямлю Полацкую — прэпадобная Еўфрасіньня. Менавіта для яе, заступніцы і апякунцы Беларускага народу, 830 гадоў назад вольны майстра полацкі, ювэлір Лазар Богша зрабіў свой знакаміты крыж. А полацкая князёўна Зьвеніслава Барысаўна прынесла да яе рэчы свае залатыя і шматкаштоўныя рызы са словамі: «*О госпоже и сестро! Вся красная мира сего ни во что ж ми ся мнит. Се дасть святому Спасу, а сама хощу поклонити главу под иго Христово*». І тады заснавала Еўфрасіньня царкву каменную сьвятога Спаса, і пабудаваў тую царкву дойлід Іван за 30 тыдняў.

Вось толькі некаторыя чыстыя крыніцы гісторыі шчаснага града Полацка, аб якіх сьпявала зямля ў Пакроўскую ноч. Што датычыцца Кліўлендзкага Полацка, то ў яго памяці таксама ёсьць юбілеі.

З 16 верасьня пайшоў 25 год, як Кастусь Калоша і Сяргей Карніловіч купілі зямлю, зь якой пачалася гісторыя вядомага беларускага куточка ў Амэрыцы з назовам Полацак. Сёлета споўнілася 17 гадоў, як тут упершыню адзначалі Беларусы Паўночнай Амэрыкі сваю XI сустрэчу і роўна год з часу высьвячэньня новай залі «Полацака» і сьвяткаваньня ў ёй І-й сусьветнай сустрэчы Беларусаў.

Гэтым і іншым памятным падзеям у жыцьці Полацкай зямлі прысьвячаем мы восьмы нумар часопіса «Полацак».

Сьвятлана Белая

— рэдактар часопіса.

## Сырцовыя цагліны.

Тарадзішча старое на зліве рэк.
Больш як дзесяць стагоддзяў назад
Першы зруб паставіў тут чалавек
І дубовы узвёў палісад.
Усё даўно прамінула і толькі вясной,
Калі повень схлыне далоў,
Аддае неахвотна абрыў над ракой
След даўно прамінуўшых гадоў.
Дагарае сонца на веснай рацэ,
Я прыйшоў на знаёмы плёс
І стаю са звычайнай цаглінай ў руцэ
Усхваляваны амаль што да слёз.
На паверхні сырцовай цагліны старой,
Што адмыла рака на свет,
Бачу я адбітак лапэткі малой,
След дзіцёнка, забыты след.
Дзевяцьсот разоў май ішоў па зямлі,
Разліваючы ў рэках сінь,
З тых часоў, як на замчышчы храм узвялі
З гэтых самых сырцовых цаглін.
Быў спякотны узень, пад ценем бяроз
Цэгла сохнула на траве,
Дойлід ей, а дзіцёнак, што ежу прынёс,
З белым пухам на галаве,
Без штаноў, — хадзіў на крывых нагах,
Еў праснірнік і розную дрэнь,
На ўзабінае племя наводзіў жах,
Даганяў свой уласны цень.
Калі б бацька на сына вочы узняў,
Ён бы мог пабачыць, што сын,
З насалодаю босай нагою ступаў
На паверхні вільготных цаглін.
І адбітак малой дзіцячай нагі
У аснову крэпасці лёг,
Шмат разоў прыходзілі ворагі
На краіны лясной парог,
Шмат разоў стагнала зямля ад тугі
І ўзрастаў на руінах палын,
Але быў непарушны адбітак нагі
На паверхні вільготных цаглін.

У. Караткевіч



# НАША ГІСТОРЫЯ

## Полацкія крывічы

Юры Штыхаў

Крывічы — *палачане ці полацкія крывічы* — насельніцтва, якое адыграла вельмі значную ролю ў старажытнай гісторыі Беларусі ды паклала пачатак нацыі, якая цяпер называецца беларускай. Гэтая этнічная супольнасьць першапачаткова ў другой палове першага тысячагодзьдзя нашай эры займала тэрыторыю сучаснай Віцебскай, паўночную частку Менскай і некаторыя суседнія раёны Магілёўскай абласьцей.

*«Першае насельніцтва ў Полацку крывічы»* — гаворыцца ў найбольш старажытным летапісу «Аповесьці мінулых часоў», а жыхары Полацкай зямлі, моцнай старажытнай дзяржавы ва ўсходняй Эўропе, называюцца ў пісьмовых крыніцах «палачанамі». Згодна тлумачэньню летапісца, назоў «палачане» паходзіць ад ракі Палата — правага прытоку Дзьвіны. На нашую думку, палачане — група плямёнаў, якая вылучылася з крывіцкага аб'яднаньня з цэнтрам у Полацку, ад якога атрымала першапачаткова сваю назву, а Полацак названы па рацэ Палата, на якой ён быў заснаваны[1]. У XI — XII стст. ды ў больш позьнія часы палачанамі называлі жыхароў Полацка, або ўсёй Полацкай зямлі дзеля чаго ёсьць шмат прыкладаў.[2]

Дасьледчыкі ўжо даўно вылучаюць групы крывічоў: полацкіх, смаленскіх, пскоўскіх паводле палітычных прыкмет — княстваў на чале зь іх галоўнымі гарадамі Полацкам, Смаленскам, Псковам. Першапачатковае ядро полацкіх крывічоў фармiравалася, як сьведчаць археолягічныя дасьледваньні, у водападзеле правых прытокаў Дзьвіны (Дрыса, Усьвяча). У далейшым расьсяленьне полацкіх крывічоў распаўсюдзілася на ўсё Беларускае Надзьвіньне й у суседнія раёны Верхняга Падняпроўя.

Надзвычай важнай крыніцай для вывучэньня этнічных пытаньняў зьяўляюцца старажытныя курганныя могільнікі — «валатоўкі». Паводля легенд, у курганах пахаваныя волаты, асілкі высокага росту. Такія назвы найбольш распаўсюджаныя ў Паўночнай Беларусі і суседніх Пскоўскай, Смаленскай абласьцях, усходняй Латвіі. У 1928 г. М.Касьпяровіч, на аснове распаўсюджанай анкеты аб «волатах, люцічах і ваўках», выказвае меркаваньне, што з назвай курганоў «валатоўкі» зьвязанае ўяўленьне аб народзе волатаў, продках беларусаў. Польскія этнографы першай паловы XIX ст. лічылі, што «крывічы» ці «крывічане» гэта і ёсьць беларусы. Такая думка пазьней неаднаразова выказвалася ў літаратуры. Яна мела сваіх прыхільнікаў, а таксама й ярых крытыкаў сярод савецкіх гісторыкаў.

Збор зьвестак аб курганных могільніках Беларускага Надзьвіньня й іх археолягічныя раскопкі праводзілі ў XIX ст. энтузіясты археолёгіі М. Кусьцінскі, К. Гаворскі, А. Семянтоўскі, Е.Раманаў, Ф.Пакроўскі. На Лагойшчыне й у іншых месцах значныя дасьледваньні зрабілі

1. Штыхов Г.В. Древний Полоцк, IX — XIII вв. Мн., 1975. с. 21-26.
2. Белоруссия в эпоху феодализма Т.I. Мн., 1959. с. 57, 59, 61, 64.

заснавальнікі беларускай навуковай археалёгіі браты К. і Я. Тышкевічы графскага паходжаньня.

Найбольш шырокае, мэтанакіраванае і плённае дасьледваньне курганоў полацкіх і смаленскіх крывічоў правёў у 20-я гады беларускі археоляг А.Ляўданскі, (нарадзіўся ў сялянскай сям'і каля Смалявіч), які з 1922 па 1927 гг. знаходзіўся ў Смаленску, затым пераехаў у Менск, тут працаваў у Інстытуце Беларускай Культуры, пазьней у рэспубліканскім гістарычным музэі, быў загадчыкам аддзелу археалёгіі. Ён згуртаваў калектыў археолягаў, які зрабіў вялікі ўклад у вывучэньне старажытнасьцей Беларусі. У самым росквіце сваёй дзейнасьці А.Ляўданскі разам з таленавітымі беларускімі археолягамі С.Дубінскім і А.Каваленям быў расстраляны ворганамі НКУСа ў Менску 27 жніўня 1937 года (усе ў адзін дзень і, відаць, у вадным месцы). Гэта быў страшэнны удар па беларускай археолягічнай навуцы, ад якога яна не магла ачуняць на працягу чвэрці стагодзьдзя. Праблемай паходжаньня крывічоў—палачан ніхто больш не займаўся ў Беларусі.

Манаграфія А.Ляўданскага, у якой былі зьмешчаныя ўнікальныя матэрыялы вынікаў яго археолягічных дасьледаваньняў крывічоў-палачан, не выйшла ў сьвет, і адзіны арыштаваны экзэмпляр карэктуры, мабыць, назаўсёды зьнік у змрочных архівах НКУС. Толькі некаторыя думкі аб гісторыі крывічоў гэты волат беларускай археолягічнай навукі пасьпеў надрукаваць раней у асобных артыкулах, зьмешчаных у трох тамах «Працаў», якія цяпер зьяўляюцца бібліяграфічнай рэдкасьцю і ня страцілі дагэтуль свайго навуковага значэньня.[3]

А. Ляўданскі адкрыў гарадзішча на рэчцы Палаце, прыйшоў да высновы, што тут у УІІІ—ІХ стст. разьмяшчаўся першапачатковы ўмацаваны цэнтр Полацка. Вывучаючы курганныя старажытнасьці смаленскіх і полацкіх крывічоў, ён разглядаў іх як адно цэлае і лічыў, што важнейшыя культурна-этнічныя прыкметы гэтага насельніцтва ў значнай ступені абумоўленыя славянізацыяй балтаў, про дкаў сучасных літувісаў ды латышоў. Думкі, выказаныя А. Ляўданскім у шэрагу выпадкаў паміж радкамі кароткіх прац 60 гадоў таму назад у часы панаваньня сталінізму, які душыў усялякую думку, што не адпавядала догматам бальшавіцкага антынавуковага тлумачэньня гісторыі народаў, цяпер, у выніку новых шырокіх дасьледваньняў, бліскуча пацьверджаныя

Фарміраваньне полацкіх і смаленскіх крывічоў мае свае асаблівасьці і перадумовы. У VIII ст. да н.э.—IУ ст. н.э. Беларускае Надзьвіньне насялялі ўсходнебалцкія плямёны днепрадзьвінскай археолягічнай культуры, асноўнымі помнікамі якой зьяўляюцца гарадзішчы. Іх упершыню дасьледваў А. Ляўданскі (Полацак, Віцебск, Старое Сяло). Значная частка сярэдняй і заходняй Беларусі, як Латвіі й усходняй Літвы, у тыя старажытныя часы была заселена таксама балцкімі плямёнамі культуры штрыхаваной керамікі, якую адкрылі адначасова А.Ляўданскі і С.Дубінскі.

У У—VIII стст. нашай эры амаль на ўсёй тэрыторыі цэнтральнай і паўночнай Беларусі склалася другая археолягічная культура, вядомая ў навуцы як пом нікі тыпу «верхняга пласту гарадзішчаў» Банцараўшчыны (пад Менскам) Тушамлі (на Смаленшчыне), Калачына (на Гомельшчыне). Фактычна гэтую культуру адкрыў у 1926 г. на Банцараўскім гарадзішчы С.Дубінскі.[4] Цяпер большасьць дасьледчыкаў лічаць гэтыя помнікі балцкімі. А.Мітрафанаў прапанаваў тэрмін «банцараўская культура», якую ён упэўнена адносіць да балтамоўных плямёнаў.[5] Матэрыялы дадзенай культуры, знойдзеныя ў культурным пласьце на многіх гарадзішчах і неўмацаваных паселішчах, у тым ліку ў Полацку, Віцебску, Лукомлі, паселішчы на Менцы. Ёсьць некаторыя дадзеныя, каб лічыць банцараўскую культуру, на наш погляд, балта-славянскай і сьцвярджаць, што славяне маюць да яе дачыненьне.

Працэс фарміраваньня крывічоў — вынік асыміляцыі прышлымі, відаць з поўдня славянамі мясцовых балцкіх і заходне-фінскіх плямёнаў, паступова славянізаваных. Мне давялося дасьледваць пасьля А.Ляўданскага з 1965 г. курганныя могільнікі полацкіх крывічоў (валатоўкі) ў Віцебскай вобласьці агульным лікам звыш 200 курганоў. У першую чаргу праводзіліся раскопкі курганоў у наваколлі старажытных крывіцкіх гарадоў Полацка, Віцебска, Лукомля.[6]

Культурныя могільнікі з трупаспаленьнямі ў доўгіх і круглых насыпах і гаршкамі-урнамі банцараўскай культуры У — УІІ стст. выяўленыя і дасьледваныя каля в.Янкавічы (урочышчы Атокі і Павалішына) Расонскага раёна і Дарахі на беразе возера Сеніца ў Гарадоцкім раёне. Гэта было нечаканае адкрыцьцё, бо лічылася, што насельніцтва банцараўскай культуры хавала памёршых у безкурганных (грунтовых) могільніках, а да культуры крывічоў-палачан адносяцца пахаваньні ў доўгіх курганах. Стала магчымым меркаваць, што банцараўская культура мае адносіны да пачатковага фарміраваньня крывічоў, была першай стадыяй у гэтым доўгім працэсе.

Курганы полацкіх крывічоў VIII -Х стст. дасьледваліся каля вёсак Баркі, Глінішча, Рудня, (Полацкі раён), Бяскатава, Вышадкі, Смалькі, Дарахі (Гарадоцкі р-н). Часта перапаленыя косьці сабраны ў неглыбокай ямцы, зьверху якой зьмешчаны перакулены ўверх дном невялікі ляпны ад рукі гаршчок. У некаторых курганах знойдзена значная колькасьць пашкоджаных агнём упрыгожаньняў, рас паўсюджаных у балтаў, характэрных таксама да культуры смаленскіх доўгіх курганоў: Бронзавыя трапецыяпадобныя падвескі (мал. 1. 1-4), шыйныя грыўні, бранзалеты, маніста, у якіх чаргуюцца шкляныя сінія пацеркі з бронзавымі сьпіралепадобнымі трубачкамі—пранізкамі (мал. 1. 20, 21) — дэталямі вянкоў, што насіліся на галаве, касьцяныя птушкі (мал. 1, 9-16). Славянскімі рысамі курганоў VIII— Х стст. зьяўляецца абрад трупаспаленьня і наяўнасьць ляпных гаршкоў з акруглым плячом у верхняй частцы тулава, якое захаванае і ў гаршках, зробленых пазьней на ганчарным крузе.

Курганныя могільнікі VIII—IX стст. адлюстроўваюць другую стадыю ці хвалю славянскай каланізацыі ў Беларускім Надзьвіньні. Але гэтае не прывяло да канчатковай славянізацыі насельніцтва.

---

3. Працы археалагічнай камісіі. Мн., 1930, т.2

4. Штыхаў Г. Спецпатрыятызм наменклатуры. Сумны лёс Банцараўскага гарадзішча. Мастацтва Беларусі. 1989, № 12. б.65-67.

5. Митрафанов А.Г. Археологические памятники восточных балтов на территории Белоруссии в эпоху железа УІІІ в. до н.э.—ІХ в. н.э. Из древней истории балтских народов : По данным археологии и антропологии. Рига, 1980.

6. Очерки по археологии Белорусии, ч. II. Мн., 1972. с. 10-27.

туе факт існаваньня гарадоў да «прызваньня варагаў», і тое, што ў гэтых гарадах было сваё этнічна вызначанае насельніцтва: «....*а первии насельници в Новъгородъ словъне, въ Полотьски кривичи, в Ростове меря, в Бъло-озеръ весь, в Муроме мурома*» [3]

Безумоўна, што землі і гарады ў той час ужо мелі сваіх князёў. Напрыклад, радзімічы, якія зьявіліся амаль адначасова з крывічамі, атрымалі сваю назву ад імя князя Радзіма. Такім чынам, у сярэдзіне IX ст. на тэрыторыі Усходняй Эўропы меліся ня проста буйныя саюзы плямёнаў са сваімі цэнтрамі-гарадамі, але зародкі будучай дзяржаўнасьці. Менавіта гэты незавершаны працэс утварэньня дзяржаваў імкнуўся скарыстаць Рурык, калі раздаваў гарады сваім васалам-варагам. Відаць, у дадзеным выпадку гэта было спробай стварыць няпроста паўночую дзяржаву на чале з Ноўгарадам, але далучыць Наўгародзка-полацка-смаленскія землі да балцка-скандынаўскага рэгіёну, які ў той час ужо сфарміраваўся. Апошні знаходзіўся на парадак вышэй у палітыка-эканамічным разьвіцьці.

*Гэтае аб'яднаньне не ўлічвала аднак дынамікі разьвіцьця асобных земель, што было закладзена яшчэ на ўзорўні племянных аб'яднаньняў. Аб гэтым сьведчыць той факт, што ў канцы X ст. летапіс прыгадвае полацкага князя Рагвалода, які палітычна ўжо ніяк не быў зьвязаны зь Ноўгарадам. Гэты князь «держащю и владеющю и княжащю Полотьскую землю» не залежаў ні палітычна, ні эканамічмна ня толькі ад Ноўгарада, але і ад Кіева. Калі ўлічваць, што ў часы Рагвалода Ноўгарад не падпарадкоўваўся Кіеву, то стане зразумела, што Полацкая зямля была незалежнаю палітыка-адміністратыўнаю адзінкаю, а г. зн. дзяржаваю ў стане першапачатковага разьвіцьця. Сведчаньнем прызнаньня гэтай дзяржавы з боку Ноўгарада і Кіева могуць быць падзеі, занатаваныя летапісцам пад 980 г. — сватаньне да полацкай князёўны Рагнеды Яраполка кіеўскага й Уладзіміра наўгародзкага. Барацьба за прыарытэт і саюз з Полацкам прывяла ледзь не да поўнага вынішчэньня полацкай княжацкай дынастыі і часовай страты Полацкам палітычнай незалежнасьці.*

Аналіз далейшых падзей на Полаччыне — аднаўленьне самастойнай княжацкай дынастыі ў пачтку XI ст., незалежная палітыка супроцьстаяньня Кіеву XI — XII стст. — дазваляе меркаваць, што падпарадкаваньне Полацка імпэрыі Уладзіміра Сьвятаславіча было фармальным, без глыбокіх эканамічных і палітычных падставаў. Інакш Полацкая зямля была-б ня ў стане так хутка адрадзіць у другім пакаленьні князёў палітыку дзяржаўнай незалежнасьці. Уласна кажучы, з князя Брачыслава Ізяславіча полацкага пачынаецца працяглая барацьба Полацка за права на самастойнае існаваньне.

Унук Уладзіміра і Рагнеды князь Брачыслаў полацкі (1001—1044) настолькі трывала адчуваў сябе на полацкім вялікакняжацкім стале, што змог упэўнена выступіць супроць кіеўскіх цэнтрысцкіх памкненьняў. З 1015 па 1020 гг., на думку некаторых кіеўскіх дасьледчыкаў, Брачыслаў Ізяславіч разам з сваім дзядзькам Яраславам Мудрым былі суправіцелямі ўсіх зямель Кіеўскай Русі[4] Сваю ўладу дуўмвірат ажыцьцяўляў праз пасрэднікаў і так званыя «двары», самі-ж князі знаходзіліся ў Полацку і Ноўгарадзе. Для гэтага былі палітычныя і генэалягічныя абгрунтаваньні, бо Брачыслаў быў нашчадкам старэйшага сына Уладзіміра і Рагнеды, а Яраслаў —другім сынам ад гэтага шлюбу. Аднак не абыходзілася і бяз спрэчак паміж самімі суправіцелямі. Пра адну зь іх яскрава апавядае скандынаўская «Сага аб Эйдмундзе»[5] Вынікам аднаго з канфліктаў стала перадача ва ўладаньне Полацка гарадоў Віцьбеска й Усьвят. З часам парытэт улады быў парушаны Яраславам, які захапіў у свае рукі Кіеў і Кіеўскую зямлю. Праўда, гэта не выклікала значнага пярэчаньня з боку полацкага князя. Брачыслаў, відаць, лічыў дастатковай для сябе тэрыторыі спрадвечных полацка-крывіцкіх земель.

Такім чынам, у першай палове XI ст. назіраўся ня толькі працэс узмацьненьня дзяржаўнасьці Полацкай зямлі, але ўсталяваньня яе ў поўных геаграфічных межах, куды ўваходзілі новыя эканамічныя рэгіёны. Гэта было-б немагчыма без пэўных унутраных сацыяльна-эканамічных зрухаў. Што сабою ўяўлялі гэтыя зрухі, могуць адказаць археолягічныя матэрыялы, і ў першую чаргу дасьледваньне гарадоў Полацкай зямлі. Найбольш маляўнічую карціну даюць археолягічныя матэрыялы сярэдзіны — другой трэці XI ст. Так, адбываецца рэзкае павелічэньне тэрыторыі старажытных гарадоў, часам зьвязанае зь пераняосеньнем умацаваных дзядзінцаў. На пачатак — сярэдзіну XI ст. прыпадае перанясеньне дзядзінца Полацка і павелічэньне яго памераў у 10 разоў, у 5 разоў павялічваюцца памеры рамесна-гандлёвага пасаду горада. З канца X ст. актыўна пачынае разрастацца Віцьбеск, зьяўляецца пасад на правым беразе Віцьбы[6]. Тое-ж адбываецца ў Лукамлі, дзе з XI ст. узьнікае яшчэ адзін пасад на левым беразе Лукомкі[7]. У XI ст. у якась ці парубежнага горада Полацкай зямлі заснаваны Браслаў[8]. Да XI ст. адносіцца ўтварэньне ўмацаваных гарадоў Кукейнаса і Герцыкі на месцы старажытных гарадзішчаў. Аб поліэтнічнасьці насельніцтва гэтых гарадоў сьведчыць зьмешаны балта-славянскі інвэнтар. Але тое, што ў пачатку XIII ст. у гэтых гарадах правілі полацкія князі, гаворыць аб безумоўным падпарадкаваньні гарадоў полацкай княжацкай уладзе[9]. Нарэшце, у XI ст. паўстае ўмацаванае паселішча — Менск-на-Свіслачы або, як лічаць некато рыя дасьледчыкі, летапісны г.Няміза. Менск ў вытоках р. Менкі (басэйн Пцічы) у XI ст. перажывае пэрыяд свайго найбольшага ўздыму, плошча яго дзядзінца і пасадаў складае ня менш за 30 га[10].

Новага, больш высокага ўзроўню дасягнула рамесьніцкая вытворчасьць, нягледзячы на тое, што рамяство цалкам яшчэ не падзялілася. У гэты час узьніклі новыя галіны вытворчасьці. З пачаткам заняпаду балтыйскай эканамічнай сыстэмы раньняга сярэднявечча ў XI. ст[11]. гандлёвыя сувязі Полацкай зямлі ўсё больш пачалі арыентавацца на паўднёва-усходнія і заходнія землі. Можна меркаваць, што на гэтым этапе ў асноўным

3. Повести Древней Руси.Л., 1983 с. 31

4. Ставиский В.И. Полоцкие князья в системе организации власти над Русской землёй в XI в. 1125-летие Полоцка. Полоцк, 1987, с. 57-58.



5. Рыдзевская Е.А. Древняя Русь и Скандинавия IX—XIУ вв. М., 1978. с.102—104.

6. Штыхов Г.В. Города Полоцкой земли. Мн., 1978. с 41.

7. Там жа. с.53.

8. Там жа. с. 58.

9. Там жа. с. 59-62.

10. Там жа. с 66.

11. Херман И. Славяне и норманы в ранней истории балтийского региона. Славяне и скандинавы М., 1986 с.128,

завяршыўся працэс славяна-балцкай асыміляцыі ў межах першапачатковага рассяленьня крывічоў і дрыгавічоў. Гэта зьяўляецца неабходнай умовай для ўзьнікненьня Полацкай зямлі. Апошняя, безумоўна, спрыяла выраўноўваньню як сацыяльнай, так і культурнай структуры дзяржавы. Гэтая тэза часьцей за ўсё выпадае з-пад увагі дасьледчыкаў, хаця нельга не заўважыць, што дзяржаўна-тэрытарыяльнае і палітычнае адзінства падразумявае калі не аднолькавасьць, то блізкасьць і падабенства ідэялёгіі і сьветапогляду жыхароў. Калі пагадзіца зь меркаваньнем В.Сядова, аб тым, што да пачатку XIII ст. хрысьціянства ня стала дамінуючай рэлігіяй на паўночна-заходніх землях Кіеўскай Русі (г.зн. Полаччыне) [12], то трэба прызнаць, што паганства як сьветапогляд не падзяляла, а аб'ядноўвала балцкае і славянскае насельніцтва гэтых зямель. У аснове паганства ляжаць адныя і тыя-ж зьявы прыроды, якія могуць адрозьнівацца па форме, але не па зьместу. Павольная хрысьціянізацыя Полацкай зямлі толькі спрыяла дзяржаўнаму ўсталяваньню.

Такім чынам, да сэрэдзіны XI ст. у нетрах Полацкай дзяржавы накапіліся магутныя ўнутраныя рэсурсы, якія давалі падставу для яе далейшага самастойнага разьвіцьця, абароны ўласных інтарэсаў, адстойваньня незалежнасьці. Усё гэта надзвычай яскрава праявілася ў другой палове XI — пачатку XII ст., у часы дзейнасьці полацкага князя Ўсяслава Брачыславіча (1044—1101).

Дзейнасьць гэтага князя заўсёды выклікала ў гісторыкаў супярэчлівыя ацэнкі. І сапраўды, можна бачыць у ім сэпаратыста і драпежніка, калі глядзець на яго з боку адзінадзяржаўя Кіеўскай Русі, імкненьня Полацка зламаць уста ляваную сацыяльна-эканамічную сыстэму гэтай дзяржавы, захапіць сабе новыя землі. Але адносіны паміж асобай і грамадзтвам больш складаныя, каб бачыць за гістарычнымі падзеламі волю аднаго або некалькі чалавек. Той-жа Ўсяслаў ня змог-бы ўсё жыцьцё пратрымацца на вялікакняжацкім полацкім сталe, калі- б яго не падтрымлівалі ўласна палачане, а праз іх —жыхары ўсёй Полацкай зямлі. Гэта сьведчыць аб тым, што князь як дзяржаўны дзеяч цалкам адпавядаў інтарэсам княства-зямлі. Што-ж да шматлікіх паходаў паміж 1065 і 1078 гг., то яшчэ ў XIX ст. В.Данілевіч слушна заўважыў нязначнасьць гэтага 13-гадовага пэрыяду ў параўнаньні з усім часам панаваньня Ўсяслава на полацкім стале.[13]

Як-жа ўспрымалася Полацкая зямля на чале з Усяславам тагачасным грамадзтвам? Як яна выглядала на агульна-палітычным і эканамічным фоне Ўсходняй Эўропы? Найбольшую інфармацыю нам даюць летапісныя артыкулы канца 60-х—70-х гг. XI ст.

Пасьля бітвы на Нямізе 3 сакавіка 1067 г. і перамоў пад Воршаю, Усяслаў апынуўся вязьнем у кіеўскім порубе-турме. У выніку паўстаньня 15 верасьня 1068 г. ён быў вызвалены й абвешчаны вялікім князем кіеўскім. У наступным годзе князь па ўласнай волі, як сьведчыць «Слова пра паход Ігара» — *«обесися сине мьглe»* —вяртаецца ў Полацак. Гэтыя 3 гады, якія высока ўзьнеслі Ўсяслава, паставілі яго ў цэнтр увагі ўсёй Усходняй ды і некаторай часткі Заходняй Эўропы.

12. Седов В.В. Распространение христианства в Древней Руси па археологическим материалам. Археология и история Пскова и Псковской земли. Псков, 1988. с.126-128.

13. Данилевич В.Е. Очерк истории Полоцкой земли до конца XIУ столетия. Киев, 1896. с.70.



У час кіеўскіх падзей 1068—1069 полацкі князь атрымлівае ня толькі магутную падтрымку з боку палачан, якія жылі на Брачыслававым двары ў Кіеве, але й ад кіеўскага духавенства. На баку Ўсяслава актыўна выступае Антоній, ігумен Пячэрскага манастыра. Разлад Антонія з выгнаным кіеўскім князям Ізяславам Яраславічам пачаўся яшчэ ў 1060 г. Гэта скончылася тым, што Антоній склаў зь сябе сан ігумена і ўцёк зь Кіева ў 1069 г. Безумоўна, на баку Ўсяслава выступіў і Нікан—вучань Антонія, ігумен Кіева-Пячэрскага манастыра з 1075 г., адзін з аўтараў летапіснага зводу «Аповесьць мінулых часоў». У 1069 г. Нікан уцякае з манастыра, ратуючыся ад Ізяслава[14]. Трэба адзначыць, што абодва манахі ў розныя часы хаваюцца ў Чарнігаве, спачатку ў князя Сьвятаслава, а пасьля ў Усевалада Яраславічаў, родных братоў Ізяслава кіеўскага. Гэта сьведчыць аб тым, што былога адзінства па між князямі-трыумвірамі ўжо не было. Нездарма ў парушэньні крыжацалаваньня пад Воршаю вінавацілі менавіта Ізяслава. Усяслаў тым часам набыў арэол пакутніка і змагара за веру. Магчыма, таму, адчуваючы і сваю частку віны ў паланеньні Ўсяслава, Сьятаслаў і Ўсевалад прыхільна адносяцца да манахаў, якія падтрымліваюць полацкага князя.

Акрамя царкоўнай апазыцыі, цэнталізаванай кіеўскай уладзе начале зь Ізяславам Яраславічам, існавала апазыцыя княжацкая. Б. Грэкаў адзначаў: *«Цэнтр недовольных Киевом князей сосредоточился в Тмутаракани»*[15]. Да гэтага часу няма тлумачэньня месца ў «Слове пра паход Ігара», якое мае дачыненьне да Ўсяслава Полацкага: *«Изь Киева дорискаше до куръ Тмуторокaня»*. А між тым, Тмутараканская старонка гісторыі другой паловы XI ст. як цікавая ,так і заблытаная.

Да 1054 г. у Тмутаракані правіць князь Мсьціслаў Уладзіміравіч — сын Рагнеды. Пасьля ўлада пераходзіць да яго брата Сьвятаслава, які сам, праўда, у горадзе не сядзіць. Як адзначаў Б.Грэкаў, у той час, пакуль Ізяслаў кіеўскі здраджваў інтарэсам сваёй зямлі, шукаў дапамогі ў Заходняй Эўропе, асобныя княствы пасьпелі настолькі ўзмацьніцца, што актыўна пачалі імкнуцца да вызваленьня з-пад улады Кіева. Гэтае агульнае імкненьне падштурхала іх да пэўнай палітычнай кансалідацыі.

У 1064 г. у Тмутаракань уцякае Расьціслаў Уладзіміравіч наўгародзкі, унук Яраслава Мудрага[16]. Гэты князь адмовіўся падпарадкавацца братам-трыўмвірам і, падтрыманы наўгародцамі, пайшоў у Тмутаракань разам з войскам. Адсюль ён выганяе сына Сьвятаславава Глеба і пачынае княжыць. Расьціслаў праводзіць вельмі актыўную, незалежную палітыку, але раптоўна памірае ў 1067 г. атручаны[17]. Расьціслаў загінуў роўна за месяц да бітвы Яраславічаў з Усяславам полацкім на Нямізе. Складаецца ўражаньне, што Яраславічы задумалі яго пазбавіцца, як небясьпечанага суседа на поўдні і магчымага саюзьніка Ўсяслава. Ненадоўга ў Тмутаракань вяртаецца Глеб Сьвятаславіч, якога бацька з дзядзькамі празь некаторы час пераводзяць на наўгародзкі стол. На яго месца прыйшоў

14. Хорошев А.С. Политическая история русской канонизации XI—ХУI вв. М., 1986, с.41-42.

15. Хорошев А.С. Политическая история русской канонизации XI—ХУI вв. М., 1986, С. 43.

16. Греков Б.Д. Киевская Русь. Л., 1953. с.496.

17. ПСРЛ, т. 1. Л., 1926. с.163.

правіць Раман Сьвятаславіч. У 1078 г. да Рамана бяжыць брат Алег Сьвятаславіч, якому замест спадчыннай Чарнігаўскай вотчыны дзядзькі прапанавалі Мурама-Разанскую зямлю. У падобным становішчы апынуўся і смаленскі князь Барыс — сын Вячаслава Яраслвіча, чыю вотчыну заняў гвалтам Уладзімір Манамах. Барыс таксама бяжыць у Тмутаракань у 1078 г. У тым-жа годзе Алег і Барыс нанялі ў дапамогу палавецкае войска і разьбілі князя Ўсевалада на р.Сожыцы 25 жніўня. Але ўжо 3 кастрычніка 1078 г. браты былі разьбіты Ізяславам кіеўскім і Ўсеваладам на Няжацінай Ніве. Тут загінулі Барыс і Ізяслаў. Спадчынны стол Алега Сьвятаславіча, па мянушцы «Гарыславіч» займае сын Усевалада Ўладзімір Манамах.

Дачыненьне сварак паўднёварускіх князёў у адносінах да Полацка, на першы погляд, выклікаюць сумненьні. Але варта супаставіць некаторыя лічбы і факты. У 1064 г. з Ноўгарада ўцякае Расьціслаў Уладзіміравіч, а ў 1065 г. Усяслаў Полацкі *«рать почаль»* і робіць першае нападзеньне на Пскоў, які належыць да Наўгародзкай зямлі. У 1066-1067 гг. Глеб Сьвятаславіч княжыць у Ноўгарадзе, але праз бацьку, шляхам сьмерці Расьціслава, дамагаецца Тмутаракані. У 1066 г. Усяслаў бярэ Ноўгарад, а ў 1067 г. летапіс адзначае, што Глеб наўгародзкі зноў у Тмутаракані. Гэта вельмі падобна на тое, што Ўсяслаў выгнаў Глеба з Ноўгарада. Абураныя такімі паводзінамі Ўсяслава або загадзя заплянаваўшы, *«Ярославичи же трие... совокупивше вои, идоша на Всеслава»* у 1067 г. Канец 1067 —пачатак 1068 гг. Усяслаў, князь кіеўскі, адпаведна «Слову пра паход Ігара» сягае да Тмутаракані і назад. Згодна надпісу на Тмутараканскім камені, у сьнежні 1067—студзені 1068 гг. князь Глеб мерыў Керчанскі праліў[18]. А ў 1068-1070 гг. ён ужо ў Ноўгарадзе. Узьнікае пытаньне аб тым, ці не паспрыяў гэтаму пераезду Ўсяслаў Полацкі. Дарэчы, у гэтыя-ж часы 1061—1074 каля Тмутаракані жыў у заснаваным ім манастыры Нікан[19]. Пасьля непрацяглага выгнаньня Усяслаў вяртае сабе ў 1071 г. Полацак, выгнаўшы адтуль Сьвятаполка —сына Ізяслава кіеўскага.

Наступае перыяд 6-гадовага заціўша. Аднак у 1077 г па незразумелых прычынах у Тмутаракані пачынае княжыць Раман Сьвятаславіч. Да яго адразу-ж зьбіраюцца незадаволеныя сваім лёсам малодшыя князі. Тым часам Усяслаў Полацкі, быццам апярэджваючы падзеі, робіць няўдалае нападзеньне на Ноўгарад у 1077 г. У падтрымку Глеба на Полацак ідзе Ўладзімір Манамах з бацькам. Але падзеі наступнага 1078 г. паміж трохкутнікам Кіеў-Полацак-Тмутаракань быццам-бы разыграны па нотах. Алег і Барыс у канцы лета авалодваюць Чарнігавам, Усяслаў хутчэй за ўсё восеньню нападае на Смаленск. Пагроза Кіеву надыходзіць з двух бакоў. У тую-ж восень адбываецца бітва на Няжацінай Ніве.

Ёсьць падставы меркаваць, што гэтая бітва і нападзеньне Усяслава на Смаленск адбыліся амаль адначасова, бо ў абодвух выпадках супроць Тмутараканскіх князёў выступаў сын Усевалада— Уладзімір Манамах. Але пад Смаленск ён не пасьпеў, нават *«о двое кони»*. Пасьпешнасьць можа тлумачыцца тым, што Манамах імкнуўся адплаціць Усяславу за напад на свой стольны горад адразу пасьля перамогі на Няжацінай Ніве, але давялося задаволіцца толькі спаленымі полацкімі прадмесьцямі.

---

18. ПСРЛ. т.1., Л., 1926. с.166.

19. Медыцева А.А. Тмутараканский камень. М., 1979. с.14.



Такім чынам, маецца ня толькі факт імкненьня асобных князёў на свае спадчынныя княжаньні, але і ўзгодненасьць іх дзеяньняў супроць цэнтрысцкіх кіеўскіх памкненьняў. Арганізатарам падобнага супрацьстаяньня Кіеву мог быць толькі Полацак у асобе князя Ўсяслава Брачыславіча. Строга аб'яднаць у адзіную дзяржаву ўсю Ўсходнюю Эўропу яшчэ ў часы Алега, Сьвятаслава й Уладзіміра скончылася безвынікова. Усходнеславянскія княствы ўсяляк імкнуліся да самастойнасьці, на першы погляд, не лепшым чынам—праз міжусобіцы. Але паходы Ўсяслава з паўднёварускімі князямі, асабліва ў 70-я гады XI ст., былі адказам на актыўную захопніцкую палітыку Яраславічаў і Ўладзіміра Ўсеваладавіча Манамаха. Апошні, як яго прашчур Сьвятаслаў, абышоў узброенымі паходамі ўсе ўсходнеславянскія землі. Калі разглядаць, што аб'яднаўчая, а па сутнасьці захопніцкая палітыка Кіева канца XI ст. садзейнічала ўзмацненьню Кіеўскай Русі і была прагрэсыўнай зьявай, то чаму яна, не пасьпеўшы разьвярнуцца, скончылася ў хуткім часе зьездамі ў Любечы (1097г), Віцічаве (1100) і на Долабскім возеры (1103). Трэба заўважыць, што ні на адным зь зьездаў не прысутнічалі полацкія князі. Ім не было чаго дзяліць, бо яны моцна трымалі ў руках тое, што ім належала.

X ст. — час нараджэньня Полацкай зямлі як адзінай дзяржавы. XI ст. — час яе станаўленьня, адстойваньня незалежнасьці, усталяваньня ня толькі зьнешніх, але й унутраных сацыяльна-эканамічных і культурных сувязяў Але менавіта яны сталі падмуркамі на шляху сталеньня беларускай дзяржаўнасьці. Яны сталі прадумоваю таго, што ў XII— XIII стст. Полацкая зямля пасьпяхова адстойвае межы, расквітае ў ёй надзвычай багатая духоўная культура. Яна цьвяроза суадносіць свае інтарэсы з інтарэсамі ўсёй Усходняй Эўропы і таму агульнымі намаганьнямі зь іншымі землямі адбівае напады крыжакоў і татар.

У канцы XIII—XIУ стст. Полацкая зямля ўступае ў мірнае пагадненьне з маладою літоўскаю дзяржаваю, што зарадзілася на захадзе ад Менскага княства. Палачане, блізкія літоўцам па крыві, але вышэйшыя па культурным разьвіцьці, шчодра дзеляцца зь імі сваімі здабыткамі. Вялікае княства —выключны ў гісторыі прыклад таго, як у межах аднойдзяржавы фарміруюцца некалькі самастойных і паўнапраўных этнасаў. Яны пераймаюць адзін у аднаго лепшыя здабыткі гістарычнага разьвіцьця, але групуюцца вакол Старажытнабеларускай дзяржавы, як найбольш вопытнай, культурна разьвітай, зь яе распрацаванымі законамі, палітычным ладам, эканомікай, гандлем, моваю. Усё гэта было-б немагчыма без закладзеных ў X—XI стст. падмуркаў самастойнасьці Полацкай зямлі.



Геннадзь Грак

# Аб іконе Багамацеры Эфескай у старажытным Полацку

Васіль Пуцко

Вось ужо другое стагодзьдзе зь легкай рукі І. Сахарава[1] існуе думка, што ікона Багамацеры Адзігітрыі з Карсунска-Багародзіцкага храма ў Торапце ідэнтычна той, што да 1239 г. знаходзілася ў Полацку. Гэтая думка жыве, нягледзячы на тое, што ужо Н. Кандакоў лічыў торапецкую ікону працай расейскага майстра ХІІІ—ХІУ стст[2]., а В.Лаўрына даказала прыналежнасць гэтага твора да помнікаў пскоўскай іканапісі першай паловы XIУ ст.[3] Дастаткова кароткага знаёмства, каб заўважыць палеалёгаўскія рысы стыля іконы з Торапца, перш за ўсё ў малюнку і ў прапорцыях. У бізантыйскай іконе, якая была напісаная да 1173 г., яны немажлівы.

Па паданьню, ікону з горада Эфеса ў Малой Азіі, напісаную евангелістам Лукой, прэпадобная Еўфрасіньня Полацкая атрымала ў дар ад бізантыйскага імпэратара Мануіла І Комніна (1143 —1180) і канстантынопальскага патрыярха Лукі Хрысоверга (1157—1170). Такім чынам, гэта магло адбыцца да 1173 г., часу паломніцтва полацкай ігуменьні, пасьля якога ёй не суджана было вярнуцца ў свой манастыр. Пабудова Спасаўскай царквы Еўфрасіньнеўскага манастыра ў Полацку можна аднесьці да 1150 г. [4] Царква праз некаторы час была ўпрыгожана фрэскамі, якія датуюцца сярэдзінай XII ст[5]. Сярод росьпісаў асаблівае месца займае выява Багародзіцы ў маленьні, якая зьмешчаная ў ніжняй частцы ўсходняй сьцяны, у апсыдзе ахвярніка. Як вядома, гэта не зусім традыцыйны сюжэт для дадзенай часткі сьценапісаў, і для яго ўключэньня ў агульную схэму патрабуюцца некаторыя прычыны. Жывапіс захаваўся даволі дрэнна, але пазнаць іканаграфічны тып Багародзіцы мажліва. На сьцяне намаляваны вядомы і шанаваны абраз. Але які?

Такая-ж выява упрыгожвае сьвінцовую актавую пячатку, знойдзеную пры археалягічных раскопках у Полацку, у 1962 г. Як лічаць спэцыялісты, яна належыла княгіне, якая магла быць дачкою або жонкай нейкага князя з хрысьціянскім імем Міхаіл[6]. Калі ўлічваць эмблемны характар гэтай выявы, якая прадстаўляецца ў спалучэньні з фігурай архангела Міхаіла, то яе залежнасьць ад агульнай з полацкай фрэскай іканаграфічнай крыніцы стане відавочнай. На манастырскіх пячатках звычайна адлюстроўвалі вобраз сьвятога або евангельскую падзею, якім прысьвячаўся манастырскі храм. Гэтую заканамэрнасьць у падборцы сюжэтаў, між іншым, пацьверджвае і пячатка ігуменьні Еўфрасіньні Полацкай, на якой Прэабражэньне спалучаецца з выявай сьв. Еўфрасіньні (Эгіпецкай з У ст., памяць 15/28 лютага).[7] Мажліва, што разам з асабістай пячаткай вядомай полацкай ігуменьні ўжывалася і пячатка манастыра, асабліва пасьля яе сьмерці ў 1173 г. Па тыпалёгіі полацкая знаходка 1962 г. родасная княжацкім булам XII— пач. XIII ст.

1. Сахаров И. Исследования о русском иконописании, кн. 2: Школы русского иконописания. — С.-Петербург, 1849, с. 13. 23 № 5.
2. Кондаков Н.П. Иконография Богоматери, т. П.—Петроград, 1915, с.222.
3. Лаурина В.К. Новые атрибуции произ ведений псковской иконописи. —Памятники культуры, Новые открытия, 1989, —М., 1990. с. 187-188.
4. Раппопорт П.А. Русская архитектура X—XIII вв. Каталог памятников,—Л., 1982, с. 96-98 №167.
5. Гісотрыя беларусакга мастацтва ў 6 тамах, т.1.— Мн., 1987, с.77-84.
6. Штыхаў Г.В. Печать XII в. из Полоцка. — Советская археология, 1956, № 3, с. 242-244; Янин В.Л.Актовые печати Дрвеней Руси X-XУ вв., т. 1. — М., 1970 .с.118, 210 (№222), 232, таб. 20, 63.



той час, як яе твар зьвернуты да гледача.

Халкапратыйскі храм у Канстантынопалі, зь якім зьвязанае шанаваньне Агіасарытысы, належаў да найбольш вядомых у бізантыйскай сталіцы. У ім захоўвалася аддзеньне і пояс Багамацеры. Гэта і стала прычынай для ўстанаўленьня царскіх хрэстных працэсій і багамольных выездаў.

Але, як вядома, рэлíквіі Багамацеры з IX ст. знаходзіліся таксама ў Влахернах, дзе таксама быў зроблены прыдзел, які называўся сьв. Ракаю. Халкапратыйская Багамацер на фрэсках, звычайна, зьвернута направа[8].



Багамацер Эфеская;



Арх. Міхаіл. Пячатка Еўфрасіньнеўскага манастыра, знойдзеная ў 1962 г.

Іканаграфічны тып Багамацеры, які зьмешчаны у ахвярніку Спаскай царквы Еўфрасіньнеўскага манастыра і на полацкай пячатцы, вызначаецца як Агіасарытыса або Халкапратыйская. Адным з характэрных прызнакаў зьяўляецца палажэньне фігуры Багамацеры, якая стаіць бокам або ў трохчацьвертым павароце, у

Аналягічна адлюстраваньню на фрэсцы, бізантыйскія майстры даюць яе вобраз на многіх іконах. Тым няменьш, тут асабліва важна адзначыць тоеснасьць у адносінах да расейскай іконы сярэдзіны ХУІ ст., якая паходзіць з Каргопаля,

7. Там жа. с. 231, 234 (№121а), т. 32, 75.
8. Пуцко В.Икона Богоматери Агиосоритиссы. —Зборник Народног музеја, кнь. УІІІ. Београд, 1975, с.354-362.

менавіта таму, што на ёй быў надпіс: «*Положение ризи сьвятыя Богороицы во Влахерне*»[9].



Палажэньне рызы сьв. Багародзіцы, Влахерна. Ікона з сабору ў Каргаполі.

Такім чынам, полацкая фрэска нагадвае аб усім, што зьвязана зь Влахернамі. Сёньня нельга сумнявацца ў тым, што сьпіс влахернскай іконы быў вядомы ў старажытным Кіеве як абраз Багародзіцы Дзесяцціннай. Такі-ж назоў меў і знакамітага храм, у якім ён знаходзіўся. Вядома таксама і тое, што гэта была старадаўняя выява Пакрова.[10] Арыгінал Дзесяціннай іконы не захаваўся, але аб

9. Живопись Вологодских земель XIУ — ХУIII веков. Каталог выставки. М., 1976, № 52
10. Пуцко В. «Богородица Десятинная» и ранняя иконография Покрова, в кн.; Festschrift fur F. von Lilienfeld sum. 65. Geburtstag.- Erlangen, 1981, s.355-373.



іканаграфіі можна меркаваць, дзякуючы рэпрадукцыі на бронзавых крыжах-энкалпіёнах канца XII ст[11].



Багародзіца Дзесяцінная. Крыж-энкалпіён. Кіеў.

Сьпісам яе, хутчэй за усё пачатку XII ст., служыць вядомая ікона Багамацеры Багалюбскай, мажліва зьвезеная з княжацкага Вышгарада разам з іконай Багамацеры Уладзімірскай. У ХУ—ХУІ стст. ужо на маскоўскай глебе зьяўляюцца шматфігурныя кампазыцыі, якія прадстаўлялі тых, хто маліўся Багамацеры Агіасарытысе: сьвятых, князёў і манахаў. Іх прынята разглядаць як мадыфікацыю старажытнай іканапіснай схэмы[12].

11. Пуцко В.Киевский крест-энколпион с Княжей горы,—Slavia Antigua, t. XXXI. - Poznan, 1988, s.209-225.
12. Грабар А.Н. Заметка о методе оживления традиций иконописи в русской живописи ХУ-ХУІ веков.—Труды от-



Ікона Багамацеры Багалюбскай. Уладзімір.

У жыціі прэпадобнай Еўфрасіньні Полацкай сказана аб тым, што яна у сілу родасных сувязей з бізантыйскім царскім домам зьвярнулася да імпэратара Мануіла з прозьбай даць у храм, заснаванай ею абіцелі, адну з трох іконаў Багамацеры, якія па паданьню былі напісаныя Лукой. Са згодай Мануіла, канстантынопальскі патрыярх Лука Хрызоверг прыслаў менавіта тую ікону, якая знаходзілася ў Эфесе. Пакольку бізантыйскай іканаграфіі застаецца невядомы вобраз Багамацеры Эфескай, то можна прыпусьціць, што размова ідзе або аб іконе, паходжаньне якой зьвязана з Эфесам, або аб сьпісе рэальна існаваўшай іконы Багамацеры Эдэскай, сьпіс якой адносіцца да IX — XI стст. і скла-

дела древнерусской литературы, т. ХХХУІ.—Ленинград, 1981. с .290-291.

дае галоўную сьвятыню царквы сьв. Алексея ў Рыме. Па паданьню, менвіта ёй пакланяўся Алексей, чалавек Божы, у час свайго знаходжаньня ў Эдэсе. Па сваёй іканаграфіі ёй блізка рымская багародычная ікона канца УІІІ ст. у царкве Сант Марыя дэль Разарыё[13]. Абедзьве назвы твора адлюстроўваюць Багамацер у іканаграфічным тыпе Агіасарытысы. Калі менавіта падобная ікона была даслана з Канстантынопаля ў Полацак прэпадобнай Еўфрасіньні, то гэта здарылася пасьля 1157 г., яшчэ да выкананьня росьпісаў манастырскага храма. Сумнявацца ў тым, думаецца, няма падставаў.

Няцяжка заўважыць, што падобныя іконы Багамацеры не былі шырока распаўсюджаныя на Русі, аб чым можна меркаваць па рэпрадукцыі ў каменных абразках, на фоне якіх адзначаюцца толькі два мініатюрных рэльефа. На адным зь іх, знойдзеным на Тэліжанецкам гарадзішчы, адлюстравана Багамацер Агіасарытыса зь сьв.Мікалаем. На другім, які паходзіць з Замчышча ў Менску, Багамацер у тым-жа іканаграфічным тыпе прадстаўлена пагрудна, а на абаротнай старане абразка выява апостала Пятра[14]. Абодва творы пластыкі XII—XIII стст. паходзяць з аднаго рэгіёну. Таго-ж часу аналягічныя іконы з выявай Багародзіцы ў маленьні вядомы бізантыйскай традыцыі, аб чым сьведчыць, у прыватнасьці, твор у манастыры сьв. Кацярыны на Сінаі[15].

13. Wright D. The earliest icons in Rome. - Art magazine, vol. 38, #1 New York, 1963. p.24-31.
14. Николаева Т.В. Древнерусская мелкая пластика из Камня. XI—ХУ вв. — Москва, 1983, №№ 359, 357. с. 144, таб. 64,63.
15. Weitsmann K. Icon painting in the Cru-



Ікона Багамацеры Агіасарытысы. Сінай.

Зьвяртаемся да выявы на полацкай пячатцы. Трэба нагадаць, што менавіта дзякуючы дадзеным сфрагістычных крыніцаў, (нават пазьнейшай (1450) стала мажлівым адрадзіць іканаграфічную схэму іконы Багамацеры Агіасарытысы, прывезенай прэпадобным Антоніем з Рыму ў наўгародзкі манастыр, заснаваны ім у 1106 г.[16] Потым гэта пацьвердзілася, дзякуючы знаходцы пячаткі XII ст. з тойжа выявай.[17] У Полацку фрэска і пячатка належаць пэрыяду прэпадобнай Еўфрасіньні. Сьценапісы выкананыя па яе заказу і пад яе наглядам. Таму можна быць упэўненым: на сьцяне ахвярніка выява Багамацеры Агіасарытысы зьявілася як рэпрадукцыя іконы Багамацеры Эфескай, Фрэска поўнасьцю адпавядае бізантыйскаму арыгіналу. На яе арыентаваўся і рэзчык штэмпеля пячаткі, якая на сёньняшні дзень застаецца найбольш важнай крыніцай, якая дазваляе судзіць аб страчанай полацкай рэліквіі.

Таму мы згодны прызнаць суадноснасьць агіяграфічнай традыцыі іконы Багамацеры Эфескай іканаграфічнаму вобразу Агіасарытысы. Гэта дазвае канкрэтызавацьць воблік згубленай полацкай сьвятыні і ня блытаць яе зь іншай іконай. Ня выключана, што ікона Багамацеры Эфескай у 1239 г. сапраўды перамясьцілася ў Торапец, дзе і скончыла сваё гістарычнае існаваньне. Але гэта ніяк не адбілася на іканаграфіі і стылі таго твора, які ў сьвядомасьці многіх пакаленьняў падмяняў старажытную полацкую ікону, сьведчаньні аб якой трэба было шукаць у самі-жа Полацку і, перш за ўсё, у сьценах храма, у якім яна была пастаўлена прэпадобнай Еўфрасіньняй.



Багамацер Эфеская. Спаская царква Еўфрасіньнеўскага манастыра ў Полацку. Фрэска.

---

sader Kingdom.-Dumbarton Oaks Papers, Vol. 20.-Washington, 1966.p. 77, fig. 58.

16. Пуцко В.Икона Богоматери Агиосори тиссы, с.361. см.Янин В. Л. Указ. соч., т.2, с.135, табл .41, 103 (№760, 761).

17. Древний Новгород. Прикладное искусство и археология.-М., 1985. ил. 38а.



# Прилогъ к прпдной мтри Єѵфросиніи.

Ты паки мати ѿ Єѵфросиніе
жителей града всѣхъ оудобреніе,
яже потщася Ікону стую
внести издални въ страну полотскую,
из црм града, камѡ из Єфесе
црь блговѣрный всечестнѡ принесе
твоегѡ ради многа прошенія,
Россійскихъ дѣля странъ оукрашенія,
припади къ стопамъ нбна црѧ,
да не лишитъ насъ толикагѡ дара.
оумоли паки возвращеннѣй быти,
Іконѣ стѣй Полотскъ оукрасити.
Очинный градъ твой, въ немже ты
трудися,
Хрту жениху си оуневѣстися:
ибо толикѡ градъ нашъ оукрашаетъ:
дивнѧ образъ и вездѣ ѡславляетъ:
Єликѡ слнцемъ нбо оукрашенно,
свѣтлыми звѣзды дивнѣ оупещренно.

Полотску граду бѣ оутвержденіе,
столпъ, стѣна, помощь и ѡгражденіе:
нинѣ безъ негѡ какѡ намъ пребыти;
аки безъ слнца не оудобно жити,
оубо ѡ мати припади за нами,
къ Гду Бгу твоими рабами:
да возвратитъ намъ Ікону стую,
просвѣтитъ землю бѣлоросійскую.
моли прилѣжнѡ и дѣву Марію,
да проявитъ намъ милость свою сію,
да не небрежетъ ѡчинна ти града
и не ѡставитъ правовѣрна стада.
оудобнѡ тебѣ мощно оумолити,
изволи токмѡ ходатайца быти,
моли за нами ѡ стая мати,
храни ны въ твоей вышнѣй блгодати:
Єяже аще ты ны не лишишь,
вся на похвалу твою ѡбратиши.
По вся дни будемъ величати.
вѣнецъ похвалы пѣсненъ соплетати.

*Сімяон Полацкі*

# «Полацкі сшытак»

Ларыса Касьцюкавец

У 1956 годзе ў бібліятэку Ягалаўскага ўнівэрсытэта, што ў Кракаве, трапіў беларускі вуніяцкі трэбнік, у вокладку якога быў уклеяны музычны рукапіс. Ён зьяўляецца вельмі каштоўным помнікам беларуска-польскай музычнай культуры ХУІ—ХУІІ стст.

У рукапіс, акрамя польскіх рэлігійных, лірычных, інтымна-любоўных песень, увайшлі канты, псальмы, вялікая колькасьць узораў танцавальнай музыкі, асобныя інструмэнтальныя творы, трохгалосныя кампазыцыі для аргана і сьпеваў на царкоўнаславянскай мове (яны былі прызначаныя для вуніяцкай царквы), а таксама цыфраваныя арганныя басовыя партыі. Усе гэтыя творы — адна, двух і трохгалосныя — запісаныя італьянскай і кіеўскай натацыямі. Тэкстжа — польскі, лацінскі, старажытнаславянскі, ужываецца таксама царкоўнаславянскі скорапіс.[1]

Трэбнік, у які быў уклеяны наш рукапіс, трапіў у Польшчу пасьля вайны з былых нямецкіх запарнікаў. На 64 лістах захоўваюцца творы вакальнай і інструмэнтальнай музыкі ХУІ-сярэдзіны ХУІІ стст. Ніякіх паказаньняў наконт паходжаньня і даты музычнага рукапісу няма. Але сам трэбнік—папяровы рукапіс ад ХУІІ ст., куды ўваходзяць 210 + ІУ лісты, мае шэраг надпісаў, якія сьведчаць аб яго даце і месцы паходжаньня. Таксама ўказваюцца асобы, зьвязаныя з гэтым трэбнікам. У версе тытульнага ліста даецца па - польску надпіс чарніламі: Pismo 1680 roku, ніжэй — алоўкам: «W 57 lat po smierci Ojca Jozefata arcybiskupa polockiego». Ведаючы, што вуніяцкі прападзвіжнік Іасафат Кунцэвіч быў забіты жыхарамі Віцебска ў 1623 г., лёгка вызначыць дату — таксама 1680 год.

На 2-7 лістах трэбніка падаецца праз усе лісты запіс па-польску : «Ma zostawac wiecznymi czasy przycerkwi Ostromakiej, ktorego podczas generalnej wizyty podpisal Dnia 30 Decembra Roku 1725 Stephan Leturibo...» На апошнім лісьце чытаем: Ten mszal jest cerkwi Ostro... wiecznemi czasy ma zastawac Anno 1721", а таксама прыпіска алоўкам: napisany w roku 1680». Абодва надпісы сьведчаць аб тым, што трэбнік стварaўся ў Астрамечыве. А. Мальдзіс піша, што гэты зборнік «хутчэй за ўсё зьявіўся на беларуска-польскім моўным пагранічч» (А.І. Мальдзіс. На скрыжаваньні славянскіх традыцый, Мн., Навука і тэхніка, 1980, с. 99.)

Як лічыць польскі музыказнаўца Е.Голас, які прысьвяціў рукапісу шэраг сваіх артыкулаў, рукапіс можа паходзіць ад 1644 -1680 гг. Папера яго мае філіграні: вазон зь кветкамі й ініцыялы А В С. Яна была распаўсюджана ў паўднёва-ўсходняй Польшчы, Украіне і заходне-паўднёвай Беларусі ў 1644 — 1650 гг.

1. Рукапіс «Полацкага сшытку», які А. Мальдзіс прывёз з Польшчы, быў расшыфраваны зь мікрафільму выпускніцай Беларускай дзяржаўнай кансэрваторыі Аленай Кузьняцовай і адрэгаваны з рэстаўрацыяй аўтарам артыкула. Пры рэстаўрацыі былі дададзеныя недастаючыя знакі. Такты рукапісу не прастаўленыя, памеры адзначаюцца толькі як трохдольныя ці квадратныя. Часам абодва памеры ставяцца поруч.



Моўныя дыялекты, а таксама характар скорапісу сьведчаць аб тым, што «Полацкі сшытак» складаўся ў беларускім асяродзьдзі. У яго ўваходзяць інструмэнтальныя творы, апрацоўкі альбо транскрыпцыі вакальных твораў.

Самую вялікую цікавасьць з усяго рукапіснага зборніка ўяўляе танцавальная музыка. Танцаў тут вялікая колькасьць. Гэтыя жанры займаюць асноўную частку рукапісу. Часьцей за ўсё ў самім нотным тэксьце адзначаецца «Taniec». Але маюцца і дакладныя назвы.

Танец № 21 называецца Stafalec[2], № 22—Taniec. Panienko sliczna, які паказвае, што музыка не толькі выконвалася на музычных інструмэнтах, але і сьпявалася. №23—Otwarzlas. Яго рытміка грунтуецца на тыповых народных танцавальных рытмаінтанацыях[3] У танцы №38 даецца шыфроўка і літары М В, а ў № 39 — літары М: В:. Пад нумарам 55 ідзе танец Witany (сустрэчны)[4], пад №57 — Niemiec, як паказвае на нямецкае паходжаньне і мае тыповую рытмаформулу chorea polonica. № 58 — Wychodzony (падношаны, зношаны), № 53 ( л, 48) — Surmeczek, ад слова Surma — труба. Сустракаюцца так сама назвы Ballet, Balleto, Balletordo, Friton. Значнае месца займае танец куранта які адпаведна зазначаецца: Curant, Curanto, Curante, Curant stanczodol stanczono. Пад № 87 змяшчаецца інструмэнтальны твор Fantasio, хутчэй за ўсё прызначаны для аргана ці іншых клавішных інструмэнтаў. Гэта першы выпадак, дзе паведамляецца аб кампазытары. (Зьверху над нотамі напісана «Pioro Zelenbowski»).

Нягледзячы на тое, што цэлы шэраг танцаў не атрымаў дакладных жанравых характарыстык, аналіз музычнай рытмікі паказвае, што ў іх аснове ляжаць рытмы танцаў, шырока распаўсюджаных у гэты час, як у Заходняй Эўропе, так ў Беларусі і Польшчы: сэры, мэнуэта, падвана, хадзонага (агульная назва старадаўніх польскіх танцаў у павольным тэмпе, трохдольным памэры, харэа палоніка (агульнаўжывальны тэрмін для алеманды, паваны й іншых танцаў).

Паміж песьнямі і танцамі, зьмешчанымі ў «Полацкім сшытку» існуе цесная сувязь. Цэлы шэраг песень (кантаў) быў гарманізаваны і выкладзены інструмэнтальна. Шмат танцаў суправаджалася сьпевам. Іх можна было граць на музычных інструмэнтах, сьпяваць і адначасова танцаваць. Для ўсіх іх пакавальнай зьяўляецца агульная музычная стылістыка і перш за ўсё — рытмічныя і мэлёдыка-інтанацыйныя асаблівасьці. Пазнаёмімся з асобнымі найбольш тыповымі ўзорамі жанраў, пададзеных у «Полацкім сшытку».

Пад № 60 даецца назва «Taniec». Гэта двухгалосны танец-шэсьце, мэлёдыя якога абапіраецца на рытмаформулы і рытмаінтанацыі алеманды  танца хадзоны, падвана  Мэлёдыка і рытміка танца арганізуецца

2. Яго рытміка ўключае тыповыя танцавальныя рытмаінтанацыі (алемандавыя іпаланезныя),  анапестычную характэрную для славянскіх, у тым ліку ўсходнеславянскіх танцаў, а таксама тыповыя кантавыя рытмаформулы 

3. Рытміка грунтуецца на рытмаформулах мазуркі  танцаў пад агульнай назвай chorea polonica,  якія характэрныя для беларускіх традыцыйных календарных песень.

4. Ён уключае тыповыя рытмаінтанацыі шэсьця і танца сэры, а таксама кантавую рыфмаформулу; 

па прынцыпу страфічных структур народных песень. У аснове мэлёдыкі ляжыць народнапесенны мэтад дакладнай і вар'іраванай паўторнасьці. Вобразныя кантрасты падкрэсьліваюцца паралельнымі мажорам і мінорам.



Вясёлы, сьвяточыны характар мае танец пад № 67. Ён грунтуецца на рытміцы падвана.

Фактура тыповая для двухгалосных танцаў. У ёй пераважаюць квінтовыя, тэрцовыя, квартовыя і ўнісонныя (актыўныя) гучаньні. Характар танца прасьветлена-ўрачысты..




У яго аснове ляжыць вар'іраваная, шмат разоў паўтораная адзіная рытмаформула: 






Пад № 69 падаецца любоўна-эратычная песьня «Dobra noc ci, Anusienku». Вядома, што на гэтую мэлёдыю (так званы формульны напеў) сьпяваліся й іншыя любоўныя лірычныя канты. Вядома і тое, што беларуская лірыка была шырока распаўсюджана ў Рэчы Паспалітай і як піша А. Мальдзіс, аказала станоўчае ўзьдзеяньне на польскую любоўную песьню, унесла ў яе «адметны паэтычны элемент — наіўны, пачуцьцёвы, шматколерны» ( А.Мальдзіс с. 87). Беларускія лірычныя канты былі вядомы на польскім каралеўскім двары. У першай палове ХУІІ ст. яны трапілі на старонкі шматлікіх польскіх зборнікаў, якія публікаваліся на тэрыторыі Польшчы, асабліва — у Кракаве. Таму часьцей за ўсё адна і тая мэлёдыя была характэрна як для польскіх, так і для беларускіх лірычных кантаў. Тут трэба гаварыць не аб іх польскім ці беларускім паходжаньні, а аб беларуска-польскай ці польска-беларускай агульнасьці. У ХУІІІ ст. на гэтую мэлёдыю сьпяваліся паэтычныя тэксты з «Аршанскага сшытку». Напеўная мэлёдыя грунтуецца на рытмаформулах танцаў алеманда, chorea polonica, а таксама тыповай кантавай рытмаформуле



У аснове мэлёдыі ляжаць кантавыя прынцыпы пабудовы музычнага твора, а таксама ўлюблёныя мэладычныя папеўкі і мэлёдыка - інтанацыйныя асаблівасьці, народна-песенныя вершавыя структуры.



Знаёмства зь некаторымі ўзорамі «Полацкага сшытку» паказвае нам на яго вельмі цікавыя зьмест і жанравыя харак тарыстыкі. Аналіз стылістыкі сьведчыць аб цеснай сувязі музычнага матэрыялу з народнымі песеннымі й інструмэнтальнымі вытокамі, у тым ліку-беларускімі, а таксама з заходнеэўрапейскай танцавальнай культурай.

«Полацкі сшытак« —своеасаблівы помнік ў музычнай культуры абодвух народаў.

Музычныя ўзоры, якія зьмешчаны ў ім, зьяўляюцца ня толькі агульнымі для Беларусі і Польшчы, бо ім уласьцівы агульнаэўрапейскія прыкметы, але былі вельмі папулярнымі ў побыце беларусаў і палякаў. Яны абапіраюцца на народную песенную і танцавальную стылістыку, уключаючы характэрныя рысы бытавой музычнай культуры. «Полацкі сшытак» патрабуе далейшага сур'ёзнага дасьледваньня.

# Эмблема на шчыце герба «Пагоня»

Міхась Белямук

За апошнія тры гады ў беларускай прэсе зьявіліся артыкулы, прысьвечаныя гербу «Пагоня». Аўтары гэтых артыкулаў атаясамліваюць рыцара на кані з паганскім бажком Ярылам, а эмблему на шчыце называюць Ярылавым крыжам. Яны не спасылаюцца на крыніцы, на працы дасьледчыкаў, спэцыялістаў, якія ўсё жыцьцё прысьвяцілі вывучэньню геральдыкі, дыплёматыкі, нумізматыкі, сфрагістыкі. І таму ў беларускага чытача, пасьля знаёмства з гэтымі «дасьледваньнямі», складаецца апінія, што ніхто і ніколі пытаньнямі герба «Пагоня» дагэтуль не цікавіўся. Аўтары замаўчваюць такія крыніцы, як Ян Длугаш (1415-1480), Ян Замойскі (1542-1605), Барташ Папроцкі (1543-1614), Сымон Окульскі (1580-1623), Віюк Каяловіч (1609-1677), Вацлаў Патоцкі (1621-1696), Каспар Нясецкі (1682-1744) —ніводзін зь іх рыцара на кані не атаясамліваў з паганскім бажком Ярылам, а эмблему на шчыце зь ягоным знакам.

Паколькі эмблема на манэтах і пячатках пераважна ёсьць тая самая, што і геральдычная фігура, то, дасьледуючы гербы, вывучаем манэты і пячаткі. XIX і XX стст. далі нам шэраг выдатных дасьледчыкаў гербаў, манэтаў і пячаткаў: Ю.Арсеньнеў, В.Белецкі, В.Белінскі, А. Бонецкі, В.Барвінскі, П.Вінклер, Ф.Восберг, М.Гумоўскі, А. Геймоўскі, Е. Дiегль, Т.Жебраўскі, Т.Жылінскі, І. Іваноў, Р.Кернсоўскі, Б.Кёне, А. Лакіер, Н. Ліхачоў, В.Лукомльскі, П.Малахоўскі, А.Малецкі, С.Мікуцкі, А.Орэшнікаў, Ф.Пекасіньскі, Г.Палячкуўна, Н.Собалева, Ул. Семковіч, І. Снегіраў, С.Трайніцкі, М. Фрайберг, А Ябланоўскі. Ніводзін зь пералічаных дасьледчыкаў эмблему герба «Пагоня» не атаясамліваў з паганскім бажком Ярылам і Ярылавым крыжам. Адносна герба яны пісалі: «князь на кані» або «збройны рыцар на кані». Але хто той князь або рыцар, яны не тлумачылі. Што датычыцца другой эмблемы герба «Пагоня», якая зьмешчаная на шчыце, то адны называлі яе «патрыяршым крыжам», другія «падвоеным», трэція «дынастычным гербам Ягайлавічаў».

У 1860 г. Б. Кёне пісаў: «Патрыяршы крыж складаецца з галоўнага стаўба і двух паралельных папярэчак». (**1**, 151). Г.Фенгер, Г.Героў, В.Унгер, укладаючы нумізматычны слоўнік, напісалі: «Патрыяршы крыж ёсьць з двума папярэчкамі рознай даўжыні». (**2**, 205) К.Шуда ў 1959 г. ўдакладніў: «Крыж патрыярхальны мае дзьве папярэчкі, з каторых верхняя карацейшая», (**3**, 63) Можна прывесьці больш прыкладаў, але абмяжуемся гэтымі. Пад падвоеным крыжам разумецца два грэцкія крыжы, спалучаныя разам. Такую інтэрпрэтацыю знаходзім ў В.Каяловіча, калі ён апісвае герб Пагоня: «На шчыце два крыжы» (**4**, 8). Грэцкі крыж мае аднолькавай даўжыні канцы. Тое-ж гаворыць К. Нясецкі адносна герба Пагоня: «На шчыце два залатыя крыжы ў адзін злучаны». (**5**, 9) Аналізуючы эмблему сьцягоў Грунвальдзкае бітвы, Я.Длугаш зазначае: «Ягайла меў пры сабе харугву рыцараў, называлася Гончай, на сьцягу мела два жоўтыя крыжы на блакітным полі» (**6**, 102) К. Нясецкі дабаўляе: «Гэты падвоены крыж паклаў Ягайла на шчыт герба Пагоні» (**5**, 550).

У бібліятэцы Арсэналу ў Парыжы пад нумарам 4790 перахоўваецца рукапісны гербавік, які дасьледвала Г.Палячкуўна. Яна зрабіла выснову, што ён быў апрацаваны ў 1434-1435 гг. Гэты гербавік Loreden Larchey апублікаваў у 1890 г. На аркушы гербавіка пад нумарам 119 зьмешчаны шчыт, які мае блакітнае поле, у полі «жоўты падвоены крыж зь няроўнымі папярэчкамі, верхняя карацейшая ад ніжняй» (**7**,15). Ф.Пекасіньскі таксама дасьледваў гербавік і пісаў: «У блакітным полі жоўты падвоены крыж з няроўнымі папярэчкамі, ніжняя даўжэйшая ад верхняй. Гэта адзін з гербаў Ягайлавай дынастыі, сустракаем на манэтах і пячатках » (**7**, 386).







Ф. Пекасіньскі ў манаграфіі, прысьвечанай польскай геральдыцы, піша: « У арсэнальскім гербавіку ёсьць гербы, якія адносяцца да Літвы — падвоены крыж» (**8**, 383).

Г.Палячкуўна ў бібліятэцы Арсэналу расшукала таксама рукапіс з тытулам «Stemmata Polonica»,які паходзіць зь сярэдзіны XУ ст. У гэтым гербавіку зьмешчана 178 гербаў Польшчы і Вялікага княства Літоўскага. Пасьля герба Польшчы зьмешчана Пагоня. Г.Палячкуўна апісвае: «На шчыце ў чырвоным полі срэбраны збройны рыцар на срэбраным кані. Накаленьнікі, страмёны, шпоры, берагі рукавіцаў залатыя. У правай далоні меч з залатой рукаяткай. У левай— шчыт блакітны з залатым падвоеным крыжам». Трэцім гербам ёсьць «у блакітным полі срэбраны падвоены крыж на зялёнай мураве». Назоў гэтаму гербу ў рукапісе дадзены «Бойча etiam Regni» (**9**, 187, 188).



«Stemmata Polonica», пачынючы з 82 аркуша, зьмясьціла гербы Вялікага кн. Літоўскага, на аркушы 96 «у полі блакітным залаты падвоены крыж» (**9**, 246). Ад камэнтарыяў Г.Палячкуўна паўстрымалася.



М.Фрідберг дасьледваў 7 рукапісных копіяў Длугашавага гербавіка. Тры рукапісы-копіі да тэкстаў маюць каляровыя малюнкі гербаў. Фрідберг піша пра герб Вялікага кн. Літоўскага: «У чырвоным полі рыцар у жоўтай зброі на белым кані. У правай руцэ рыцара белы паднесены, аголены меч з залатой рукаяткай. У левай руцэ шчыт, у блакітным полі падвоены бледнажоўты крыж» (10, 96). Гэтыя рукапісныя копіі Длугаша паходзяць: найстарэйшы з пачатку ХУІ ст., наймаладзейшы — канца ХУІ ст.

У дзяржаўным архіве ў Штакгольме знаходзіцца гербавік, пад назовам Кодэкс Бергшамэра. Праўдападобна, гэты гербавік бургундзкага паходжаньня.



Прыблізна ў ХУІІ ст. ён трапіў у Швэцыю, да 1933 г. перахоўваўся ў прыватнай бібліятэцы Бергшамэра й ад уласьніка атрымаў назоў. Кодэкс мае 247 пергамэнтных аркушаў, апраўленых у скуру. Швэцкія дасьледчыкі лічаць, што ён паходзіць зь першай паловы ХУ ст. На аркушы 46-м зьмешчаны герб Вялікага кн. Літоўскага «Пагоня», а побач шчыт: «у блакітым полі падвоены залаты крыж». «Пагоня»: «У полі чырвоным на срэбраным кані рыцар срэбраны з паднятым мячом і шчытом чырвоным, у полі калюмны залатыя. Герб укаранованы, лябры чырвоныя, крылы чырвоныя, у якіх залатыя калюмны» (11, 80).

Адносна герба «Пагоня» дасьледчык А.Геймоўскі піша: «Герб гэты, праўдападобна, адносіцца да Жыгімонта Кейстуціча часоў 1432—1440». У зносцы чытаем: «Герб гэты вельмі падобны да герба на аркушы 10 з той розьніцай, што на аркушы 57 так званыя літоўскія калюмны на шчыце рыцара паказаны згодна з тымі, якія сустракаем на манэтах і пячатках Вітаўта і Жыгімонта. На пячатках Ягайлы й ягоных сыноў, на шчыце ёсьць патрыаршы крыж або падвоены крыж замест калюмнаў» (11. 80).

На 10 аркушы знаходзім паміж гербамі князя апольскага і князя зембіцкага шчыт «у чырвоным полі на срэбраным кані рыцар у срэбранай зброі з узьнятым мячом, на левым плячы шчыт чырвоны з залатой эмблемай. Шчыт увенчаны белым шлёмам з чырвонымі лябрамі. У шлёме чырвоныя крыльлі з залатой эмблемай». Над шчытом надпіс: «h(ertoge) Lettouwen) (11, 78). У зносцы А.Геймоўскі піша: «Гэта ёсьць адзін зь першых каляровых малюнкаў Пагоні, што да эмблемы на шчыце, то да гэтага часу яна не сустраканая» (11, 78).





На тым-жа 57 аркушы гербавіка знаходзіцца невялікі шчыт « у чырвоным полі на срэбраным кані рыцар у срэбранай зброі з узьнятым мячом, на левым плячы шчыт з блакітным полем, на якім падвоены залаты крыж». (11, 81). Паколькі надпісу няма, А.Геймоўскі ў зносцы піша: «Пагоня была ня толькі гербам Вялікага кн. Літоўскага, але й асобных земляў (пазьней ваяводстваў). Паколькі троцкае княства, рэпрэзэнтаванае ў гербавіку старым гербам з часоў Кейстуця, менавіта першым рыцарам зь дзідай, таму можна зрызыкаваць і аднесьці гэты герб Пагоню да віленскай зямлі» (11, 81).







На аркушы 146 гербы польскага каралеўства. На першым мейсцы герб Польшчы і 10 гербаў. Пад нумарам 6 шчыт: «у блакітным полі падвоены залаты крыж».



На аркушы 213 гербы вугорскага каралеўства і на другім мейсцы пасьля дзяржаўнага гербу шчыт: «у чырвоным полі падвоены срэбраны крыж на зялёнай мураве». (11, 98).

У сувязі, што на двух шчытах у блакітным полі маем «падвоены» залаты крыж і няма каля іх надпісу, А. Геймоўскі ў знойсцы 43 піша: «Эмблема гэта зьявілася на дынарах Уладыслава Ягайлы, а з 1413 г. на канцылярыйскіх каралеўскіх пячатках над шчытом гербаў Каралеўства. Яна як дынастычны герб перайшла на пячаткі сыноў Ягайлы, але за Аляксандра трапіла паміж герба правінцыяў на вялікія пячаткі Польшчы і зьбераглася да Станіслава ІІ Аўгуста. Характар патрыаршага крыжа як дынастычнага герба выразна падкрэсьлена на саркафагу Казіміра Ягайлавіча, дзе шчыт з крыжам зьмешчаны зусім асобна, у нагах караля. Да сёняшняга дня ня ёсьць высьветлена генэза гэтага герба дынастыі Ягайлы. Мажліва, што Ягайла прыймаючы пры хрышчэньні імя Ула-

дыслава здэцыдаваўся таксама ўзяць за эмблему герб свайго патрона Ўладыслава вугорскага. Магчыма, што гэта наступіла за парадаю хроснага бацькі, Апольскага князя Ўладыслава. ( **11**, 80).

Думка А.Геймоўскага, што Ягайла, прымаючы каталізыцызм 15 лютага 1386 г. ўзяў сабе за эмблему вугорскі крыж, нам здаецца мала верагоднай. Вугорскі кароль Сьцяпан у 1000 годзе прыняў хрысьціянства, але толькі за караля Бэлы III (1173-1196) патрыяршы крыж або падвоены крыж, зь верхняй папярэчкай карацейшай ад ніжняй, зьявіўся на вугорскай манэце. (**12**, №112) Ягоныя наступнікі чаканяць манэты з гэтым крыжам (**12**, 127, 128, 163, 164, 179, 212, 224, 226, 251, 252, 284, 318, 374, 377). Сустракаюцца манэты з крыжам, у якіх папярэчкі аднолькавай даўжыні, але справа не ў даўжыні папярэчак, а ў тым, чаму гэтая форма крыжа зьявілася на вугорскіх манэтах і стала гербавай фігурай Вугоршчыны.

Дасьледчык Бізанытыі Д. Обаленскі інфармуе, што бізантыйскі імпэратар Мануіл у 1163 г. заручыў сваю дачку з вугорскім прынцам Бэлай. Бэла, прыехаўшы ў Канстантынопаль, хрысьціўся, атрымаў імя Аляксея. Мануіл надаў яму тытул дэспата і абвесьціў, што Бэла будзе ягоным спадакаемцам. Аднак, неспадзявана для Мануіла, ягоная жонка нарадзіла сына ў 1169 г. Мануіл зьмяніў сваю пастанову. Заручыны ўняважніў з дачкой. Ажаніў Бэлу з братавой прынцэсай Ганнай, і дазволіў яму ўжываньне «імпэратарскага падвоенага крыжа», які Бэлай III і ягоным наступнікамі дынастыі Арпадаў стаў ужывацца як герб «coat-of arms» Вугоршчыны (**13**, 162-163).

«Падвоены крыж» сьведчыў аб пакравенстве Арпадаў зь імпэратарамі Бізанты. Калі дынастыя Арпадаў па мужчыскай лініі вымерла ў 1301 г. і запанавала новая дынастыя Андагавэнаў у 1308 г. на вугорскіх манэтах чаканяцца паясы і лілії — герба Андагавэнаў, але падвоены крыж не згубіўся, бачым яго на манэтах Людвіка (1342-1382), Жыгімонта (1386-1437), Альберта (1437-1339), Уладыслава (1440-1444), Яна Гуная (1446-1453).



Людзьвіка



Жыгімонта



Альберта



Уладыслава



Яна Гуная

Прыймаючы каталіцызм, больш лагічным было-б для Ягайлы ўзяць лацінскую форму крыжа. Падвоены крыж быў гербам даўно вымерлай дынастыі. Ядзьвіга мела свой дынастычны герб — паясы і лілії. Герб гэты, зьмешчаны на мастычнай пячатцы Ягайлы, Казіміра і на вялікіх канцылярыйскіх пячатках Польшчы, за панаваньня Аляксандра, Жыгімонта, Жыгімонта Аўгуста. Але ніхто ня лічыць дынастычным гербам Ягайлавічаў паясы і лілії.

М.Гумоўскі ў 1920 г. падтрымаў спасьцярогу Ф.Пекасіньскага, што «падвоены крыж павінны ўважаць за герб радавы караля Ўладыслава...і генэзу гэтага крыжа і герба пажадана шукаць у грэцкім царкоўным абрадзе, які быў моцны ў Польшчы ў часы панаваньня Ягайлы і асабліва моцным меў уплыў у Літве да Вітаўта і ў часы Вітаўта» (**14**, 65; **15**, 105)

(Працяг у наступным нумары)



## Бібліяграфія


1. Б.Кене. Олег й Куник. Русский Вестник СПб. 1860.

2. H.Fengler, G.Gierow, W.Unger Lexikon Numismatic. Словарь Нумизмата. М. 1982.

3, K. Szuda. Niopublikowane denary Boleslawa Chorebrego z napisem cyrylicznym, WN, # 1-2. W. 1959.

4.W. Kojalowicz. Herbarz Rycerstwa W.X.Litewskiego, tak zwanny Compendium. K. 1897.

5.K.Niesiecki. Herbarz polski. t.1, Lipsk, 1839-1846.

6. J.Dlugosz. Roczniki czyli Kroniki slawnego krolestwa Polskiego. ks. X1, W. 1982

7. H.Polaczkowna. Najstarsze pomniki heraldyki polskiej. Tow. Nauk. we Lwowie Archiwom t.2. Lwow 1924.

8. F.Piekosinski. Heraldyka polska wiekow srednich. K. 1899

9. H.Polaczkowna. Stemmata Polonica. Tow Nauk we Lwowie. Lwow, 1929. t.1.

10. M.Friedberg Klejnoty Dlugoszowe. Rocz PTH .t.X, W.1930.

11. A.Heymouski. Herby polskie w sztokholmskim Codex Bergshammera. St. Zr. t.XII, W . 1967.

12. L.Rethy. Corpus Mummorum Hungariae. Graz 1958.

13. D.Obolensky The Byzanine Commonwealth. Easteran Europe 500-1453. NewYork - Washington, 1971.

14. F.Piekosinski. O Monecie i stopie menniczej w Polsce w X1Y i XY w. Rozp. Spraw, Wydz. Hist.- Fil. Ak.Umiej. t. 9. K. 1878.

15.M.Gumowski. Numizmatyka litewska wiekow sredn ich, WNA. t. 1X, K. 1920.




Жыгімонт Люксембургскі 1386-1437 Графюра А.Дзюрэра Нюрнбергскі музэй,




Полацак
Кліўленд ЗША часопіс



# ПАМЯЦЬ ЗЯМЛІ

## Лісты ад Міколы Ермаловіча

Міхась Белямук

24 студзеня 1983 г.

«Літвы (як я разумею) было дзьве: правабярэжная і левабярэжная (у адносінах да Нёману), таму ня выключана, што правабярэжная сапраўды плаціла дань Полацку. У адносінах да другой, то трэба ўлічываць тое, што паводля Іпатаўскага летапісу пад 1235 г. (але некаторыя дасьледчыкі лічаць, што каля 1237 г.) Даніла Галіцкі *«возведе Изяслава Новогородского и Литву Миндовгову на Кондрата Мазавецкого»*, г.зн., левабярэжнае Панямоньне знаходзілася ў нейкай палітычнай залежнасьці ад галіцка-валынскіх князёў. Я цаню Васпана меркаваньне, што Брачыслаў мог аддаць Эймунду Панямоньне, я дадам, правабярэжнае Панямоньне. Некаторыя дасьледчыкі (не маю пад рукою запісаў, на якія мог-бы спаслацца), меркавалі, што Эймунд атрымаў быццам тыя землі, што залежалі ад Полацка па Дзьвіне, што ёсьць сумніўна. Пытаньне гэтае нам вельмі важнае, хоць скамплікаванае. У Эймундавай сазе ёсьць шмат і фантастычнага. Я зусім не адкідаю думку, што паходы Яраслава ў 1038 г. на яцьвягаў і ў 1040 г. (магчыма й у 1044 г.) на Літву маглі быць накіраваныя супроць Полаччыны. Але іх яшчэ раз трэба добра праналізаваць. Скажу яшчэ: я лічу, што першапачатковай прычынай варожасьці Ўсяслава зь Кіевам была барацьба з-за Літвы.

22 красавіка 1982 г.

Я ўважліва перачытаў уступную частку «Панямонскай загадкі» і раблю такія заўвагі. У адрозьненьне ад іншых панямонскіх гарадоў - гісторыя Навагрудка (пісьмовая) пачынаецца з часу яго заснаваньня — 1044 г. Панямоньне верхняе было заселена ня толькі яцьвягамі, але і літвой, бо без уліку апошняга будзе незразумелым, чаму дзяржава ста ла называцца Літвой. Цяжка сказаць, якая культура дрыгавіцкая ці крывіцкая была дамінуючай у Панямоньні. Ф.Гурэвіч настойвае на першай, В.Сядоў на дру гой. Для нас найбольш важна тое, што тут жылі адны і другія. Дрыгавіцка-крывіцкай фэдэрацыі не магло быць, а было арганічнае зрашчэньне дрыгавіцкай і крывіцкай тэрыторыяў і насельніцтва. Зьяўленьне дрыгавічоў у Панямоньні ня згодны тлумачыць ратаваньнем іх ад на ступу Русі, але іх каланізацыйным рухам. Вонкавыя прычыны ніколі не дамінавалі над унутранымі. Што да Навагрудка, то ён быў закладзены Яраславам у 1044 г. і быў менавіта рускім фарпостам, што я неаднаразова пісаў. Фарпостамі Русі былі іншыя дрыгавіцкія гарады — Клецк і Слуцк. Нездарма за напад на іх, як пазьней на Наваградак, Уладзімір Манамах жорстка расправіўся з Глебам Менскім.

Наконт вынікаў паходаў Яраслава на яцьвягаў у 1038 г. крыніцы дыямэтральна разыходзяцца, прыкладам «Летапісны звод 1479 г.» гаворыць аб няўдачы Яраслава. Хлебнікаўскі і Пагодзінскі спіскі Іпатаўскага летапісу кажуць: «Победи их». Мне здаецца, што больш праўдападобным другое сьведчаньне. Не перамогшы яцьвягаў, Яраслаў ня змог-бы пайсьці на Літву ў 1040 г., яе пакарылі яцьвягі. Наконт таго, у якім кірунку быў паход 1040 г., то Я.Длугаш адзначае, што Яраслаў разьбіў Літву на палях слонімскіх, у бок Наваградка, відаць, быў накіраваны паход 1044 г. у выніку чаго быў збудаваны гэты горад. Вядома, гэта не выключае таго, што тут было раней нейкае ўмацаваньне, якое разбурыў Яраслаў і пабудаваў новы горад. Мне здаецца, што нельга атаясамліваць старажытную культуру Горадні з культурай іншых панямонскіх гарадоў. Гісторыя яе адметная, і асаблівасьці яе культуры нельга пашыраць на культуру ўсяго Панямоньня. Але я на гэтым не настайваю, бо пытаньнем не займаўся, не лічу сябе кампэтэнтным у гэтых пытаньнях. Вядома, нам у навуковых выданьнях трэба быць асьцярожнымі й аб'ектыўнымі, бо без гэтага абясцэніваецца праца. Толькі аб'ектыўная гісторыя мае каштоўнасьць. Гісторыя-ж Бела русі ніколі не была аб'ектыўнай. Вось-жа такую аб'ектыўную гісторыю мы павінны стварыць. А для гэтага мы павінны яе дэталёва дасьледваць, чаго раней не было зроблена. Мы павінны занава перачытаць усе крыніцы, усебакова іх асэнсаваць, прадыскутаваць, каб атрымаць усю нам патрэбную інфармацыю. А гэта нялёгкая справа, жывучы ў такіх умовах. Сябра мяне папракае, што прыпісваю Міндоўгу летувіскае паходжаньне, але-ж я пішу, што старажытная Літва зусім не тая, што сучасная Летува, што яна гістарычная вобласьць Беларусі, таму і Міндоўг — беларускі гістарычны дзеяч. Вядома, цяперашнім летувісам не прыемна, і яны з скуры вылазяць, каб даказаць, што Міндоўг іхняга паходжаньня. Зразумела, што адступіся ад яго, яны страцяць свае ўяўныя правы на прыналежнасць ім гісторыі Вялікага кн. Літоўскага. Мы, аднак, павінны адказаць, прыходзіць пара на гэта, што старажытная Літва — гэта наша гісторыя, што гэта гістарычная вобласць Беларусі і гэта растлумачывае, чаму першай сталіцай ВКЛ стаў Наваградак.

10 кастрычніка 19982 г.

Шчыра дзякую за ліст і за «Панямонскую загадку». Я ўважліва перачытаў і зь цікавасьцю. Нязгодны, што націск Русі на дрыгавічоў прымусіў іх перасяляцца. Вядома, быў націск, але ён быў недастатковы для таго, каб выцінуць якоенебудзь племя зь яго тэрыторыі. Гэтага нельга было рабіць таму, што Кіеў ня меў магчымасьці засяліць выцеснутую тэрыторыю, а мець пустую зямлю было нязручна, з каго-ж браць даніну? Кіеў быў рады прыхапіць сабе чужое насельніцтва, бо свайго яму не хапала. Летапіс пад 987 г. сьведчыць, што Уладзімір пабудаваў гарады каля Кіева і насяліў іх славянамі, чудзьдзю, крывічамі і вяцічамі. У 1116 г. сын Уладзіміра Манамаха Ярапалк, захапіўшы Друцк, жыхароў яго вывез у сваю Пераяслаўскую зямлю. Такім чынам, Кіеў перш за ўсё быў зацікаўлены ў тым, каб заняволенае ім насельніцтва не разьбягалася ў розныя бакі. Трэба памятаць, што каланізацыйны рух, як правіла, працякае незалежна ад палітычных умоў. Гэтак-жа сама этнічны працэс ідзе, не зважаючы на палітычныя перагародкі. Тэрыторыя Беларусі ў старажытныя часы была падзелена на шэраг палітычных сыстэм: Полацкую, Тураўскую, Смаленскую, Чарнігаўскую, Наваградскую, Літоўскую. Аднак працэс асыміляцыі балтаў і зрашчэньне крывіцкай і дрыгавіцкай тэрыторыяў руйнавалі палітычныя межы і тварылі адзіны беларускі народ. Гэтак-жа культурны ўплыў мог свабодна ісьці без палітычнага ўплыву. Калі ў Панямоньні яскрава выяўляецца рознабаковае культурнае ўзьдзеяньне Полацку, то гэта ня значыць, што гэта зямля была пад уладай По-

---

Заканчэньне. Пачатак №№4, 5, 6-7.

лацку. Нагадаю, што Полацак ня мог валодаць левабярэжным Панямоньнем, тут распараджаліся галіцка-валынскія князі. Аднак, нягледзячы на палітычную мяжу, культурны ўплыў Полаччыны ішоў сюды і разам з гэтым этнічны працэс, які ўцягнуў Панямоньне ў беларускі этнагенэз. Мая парада: нельга ідэялізаваць узаемаадносіны дрыгавічоў і крывічоў зь яцьвягамі, бо першыя, як і апошнія былі аднолькавымі разбойнікамі, як і ўсе старажытныя плямёны. Ва ўсякім выпадку, у пачатку яцьвягі не змаглі мірна ад носіцца да засяленьня іх земляў. Толькі ўжо пазьней, калі іх супрацiўленьне было зломана, яны маглі больш-меньш мірна ўжыцца. Але трэба памятаць, што паводля В.Рацішчава, Барыс Полацкі ў 1102 г. зрабіў паход на яьцвягаў і імі засяліў пабудаваны ім горад Барысаў. Што да блізасьці яцьвягскай мовы да славянскай, то трэба ўлічваць апошнія дасьледваньні, паводля якіх (В.Сядоў) фармаваньне славянаў пачалося на мяжы з заходнімі балтамі (прусамі й яцьвягамі), што і тлумачыць большую моўную блізасьць да славянаў гэтых балцкіх плямёнаў. У пазьнейшыя часы (канец XII-першая палова XIII стст.) тураўцы і пiняне, спачатку незадаволеныя ўладай кіеўскай, а пасьля галіцка-валынскай, выкарыстоўвалі суседніх зь імі яцьвягоў і літву для набегаў на сваіх прыгнятальнікаў. Яшчэ адна заўвага. Не ўсе дрыгавіцкія гарады мелі аднолькавае вайскова-палітычнае прызначэньне. Калі Менск і Заслаўе былі сапраўды апораю Полацку супроць Кіева, то Навагрудак, Слуцак, Клецк і іншыя былі апораю Кіева супроць Полацка.

6 лютага 1983 г.

Цалком вас падртымоўваю ў аспрэчваньні ўдзелу Брачыслава ў паходах Яраслава на яцьвягаў у 1038 г. і на Літву ў 1040 г. Упершыню гэты домысел у навуковы ўжытак унёс І. Беляеў, і яго некрытычна пачалі паўтараць далейшыя дасьледчыкі. Заўважу, што Брачыслаў ня толькі ня мог удзельнічаць у гэтых паходах, але відаць, што ён супрацьдзейнічаў. Тут асабліва важныя тацішчаўскія зьвесткі. Вельмі добра, што намацы ваеце шляхі да ўстанаўленьня хрысьціянскага імя Усяслава. Гэтае дасьледваньне стане рабочай гіпотызай і стымулам іншым. Што да Брачыслава, я лічу вельмі рызыкоўным спалучаць летапісныя зьвесткі з матэрыяламі сагі і рабіць высновы, што Брачыслаў і Яраслаў ваявалі між сабою ў 1040—1041 гг. Як вядома, гэта барацьба прыпадае на 1021 г., яе, здаецца, мае на ўвазе «Эймундава сага». Бясспрэчна, што летапісы ўсе без выключэньня тэндэцыйныя, яны складаліся ў інтарэсах таго ці іншага ўладара. Аднак гэтая ісьціна не дае нам права іх ігнараваць. Мне здаецца, сябру бянтэжыць, калі кажу, што Панямоньне разам зь Літвой было заваявана Кіевам, а сябра кажа, што знаходзім тут моцныя ўплывы полацкай культуры. Гэта адно другому не супярэчыць. Культурнае, як і этнічнае пашырэньне ня ведае (правільней не прызнае) палітычных межаў. Яно працякае празь іх, а ў далейшым і размывае іх. Апроч таго, трэба адрозьніваць левабярэжнае і правабярэжнае Панямоньне, левабярэжную і правабярэжную Літву. Калі ў першых была перавага палітычная Кіева, то ў другім — Полацку. Калі я ўказаў на тое, што Даніла Галіцкі, «воздеде» Літву Міндоўга й Ізяслававa Навагародскага, то я гэтым хацеў зьвярнуць увагу на вялікую залежнасьць ад галіцкага-валынскіх князёў.



24 сакавіка 1983 г.

16 сакавіка рабіў даклад у Менску. Мелася на мэце невялікае кола людзей, але прыйшло шмат больш, былі навукоўцы, студэнты ды іншыя з творчай інтэлігенцыі. Тэма даклада была: «Старажытная Беларусь у гістарычнай літаратуры». Галоўнае месца ў дакладзе зай мала тэма аб утварэньні ВКЛ. Гаварыў я каля двух гадзінаў, людзі слухалі ўважліва, была цішыня. Мажліва, што напружаньне было, бо гаварыў без паперак, цытаваў з памяці. Здаецца мне, што я вялікую колькасьць сваіх слухачоў пераканаў у тым, што гісторыя нашая сфальсыфікаваная, менавіта ўтварэньне ВКЛ. Растлумачыў, дзе знаходзілася старажытная Літва, якую ролю адыграў у нашай гісторыі Навагрaдак. Аднак, на жаль, гэтым маім думкам цяжка знайсьці афіцыйнае прызнаньне. Там па-ранейшаму гаворыцца аб уладзе літоўскіх фэўдалаў над Беларусьсю, аб гэтым сьведчаць новыя кнігі і падручнікі. У № 3 часопісу «Нёман» зьмешчана рэцэнзія М.Улашчыка на «Историю БССР» ч. 1 (яна прызначана для студэнтаў БНУ). Улашчык закрануў вельмі добра некаторыя моманты нашай гісторыі. Добра, што ёсьць каму лавіць фальсыфікатара за руку;

28 травеня 1983 г.

Сябра паставіў перад сабой вельмі прывабную мэту, значыць, што коньнік на гербе Вялікага княства Літоўскага — праобраз Усяслава Чарадзея, а крыж на шчыце— гэта крыж Еўфрасіньні. Вядома, калі гэта зможаш зрабіць, калі прымецца дасьледчыкамі, то зьявіцца важным на вуковым адкрыцьцём. Але для гэтага прыйдзецца нямала папрацаваць і сабраць вельмі пераканаўчыя доказы. Мне пакуль невядомы крыніцы, якія сьведчалі аб гэтым. Тое, што Ягайла быў праваслаўным — усім вядома, але гэта ня можа быць доказам яго полацкага паходжаньня. Я прытрымліваюся думкі, што вялікалітоўскія князі, прынамсі ад Віценя, вядуць свой род з Полацка, але пераканаўчых доказаў гэтаму не маю, ёсьць толькі ўскосныя. Васкрэсенскі лептапіс патрабуе грунтоўнага разгляду аб родзе літоўскіх князёў. Не так там усё выдумана, як гэта цьвердзяць некаторыя дасьледчыкі (прыкладам Пашута). Ва ўсякім выпадку, размову аб вытоках роду літоўскіх князёў трэба пачынаць з гэтай крыніцы, а пасьля ўжо прыцягіваць для падмацаваньня іншыя. Паганства вялікалітоўскіх князёў было выдумана спачатку крыжакамі, іх храністамі, а таксама падробкай грамат Міндоўга і Гедзіміна, пазьней гэтая вэрсыя паганства перайшла ў Маскву. Нельга забываць, што Вялікае княства Літоўскае адразу ўзьнікла зь першай сталіцай у Навагарадку, як дзяржава беларуская і хрысьціянская, праваслаўная, а не як літоўская (у сучасным значэньні гэтага слова) і паганская. А ці чуў сябра новую тэорыю ўзьнікненьня ВКЛ, якую выклаў А Ахманьскі? Паводля гэтай новай канцэпцыі, карэнная Літва, абапіраючыся на паасобныя балцкія вастраўкі змагла пад началіць сабе суседнія славянскія землі й утварыць сваю дзяржаву. Незразумела толькі адно, чаму гэта не магла зрабіць Літва тады, калі славянскія калёніі былі мізэрнымі вастраўкамі ў моры балцкай тэрыторыі, чаму дапусьцілі да ўтварэньня на балцкай тэрыторыі такіх славянскіх дзяржаваў як Полацкае і Тураўскае княствы»




Аднаго дня мы зь Лёляй (братавай жонкай) дамовіліся зайсьці да Ганны Левінай і запытацца, ці прывезла яе сястра Галя нейкі кавалак сала ці клінковага сыру ў абмен на вопратку? Калісьці мой брат быў суседам Левіных пагэтаму знаёмства нашае было даўняе. Пагрукалі ў дзьверы, адтуль мужчынскі голас: «Уваходзьце». Божа мой, у хаце вэрхал, па ўсяму відаць быў вобыск. Адзін з мужчынаў ляжыць на голым матрацы ў ботах, другі сядзіць за столікам, на якім акуркі, бутэлька самагону. Ён паціху гаворыць, што Ганна зараз прыйдзе, каб мы пачакалі. Але чаго чакаць, усё ясна, трэба чым мага хутчэй уходзіць. Моўчкі крочу на прыступкі, мужчына хапаецца за наган: «Назад! Вярніцеся, сядайце, дакумэнты!» Дастаю з кішэні свой аўсвайс — даведку, што я на ўліку ў аддзеле мастацтва гарадзкой управы.

«Вось вы ужо прадаліся немцам. Наш дзядзя Ваня ведае ўсё аб вас». Бачу, што гестапавец выдае сябе за партызана, але маўчу. Ён вяртае аўсвайс, вырывае з рук Лёлі сумку, рыецца ў ёй. Потым загадвае свайму напарніку некуды адвесьці нас. На двары суседка крычыць (бо глухая) на вуха Лёлі, што ўначы схапілі Ганну з двумя дзяцьмі і невядома куды адвезьлі .

Мы ідзем да гары па Ленінскай, ад бальніцы ўбок пляца Волі, нас прыводзяць у чырвоны дом, на другі паверх. У пакоі шмат людзей, падобных на таго, што з намі. Спачатку выклікалі Лёлю, за ёй мяне. За сталом сядзіць сівы эсэсавец у форме і нейкая жанчына. Сівы задае пытаньні на добрай расейскай мове: «Прафэсія? Чаму вы апынуліся ў Левінай? Ці ведаеце сястру Галіну? Яна сувязная, жонка савецкага лётчыка. Мы шукаем партызанку Галіну». Галіну я не ведаў, тым больш ня мог сказаць, дзе яна зараз. Відаць, мае адказы ня выклікалі падазрэньня, аднак сівы скамандаваў на выхад — чакаць прысуду. Потым запытаўся ў жанчыны на нямецкай мове, што рабіць. «Гефенгнісгауз», — сказала яна, што азначала турма. «Толькі не гефенгнісгауз», спалохаўся я. Чым вінаватыя мы? Мы-ж прыходзілі за пасылкай ад маткі». «Добра», — быццам-бы пагадзіўся сівы, — будзеце сядзець тут да цямна, а там паглядзім.

У 14 гадзінаў прынесьлі міску кіслае капусты і дзьве лыжкі. У 18 — прыйшоў да нас афіцэр СС. Пачаў размову пра тое, што партызаны нахабнічаюць, але яны спыняць іх выбухі на дарогах. Ён трымаў нас ў сябе столькі, колькі лічыў патрэбным, бо хацеў, каб Галю ніхто не папярэдзіў. Перад самым выхадам параіў нам сядзець у хаце 3 дні.

*(Ганя з двумя дзецьмі загінула ў лягеры, што па віліцы Чырвонай, (зараз там тэрыторыя радыёзавода), а Галіну смаленскае гестапа так і не затрымала. Як партызанка яна была ўзнагародажна партызанскім медалём першай ступэні).*

---

(Працяг. Пачатак у №№ 5, 6-7.)



У адзін зь летніх вечароў я убачыў, як у наш завулак падкаціла нямецкая машына і спынілася ля дома, што насупраць. Але людзі, якія выйшлі зь яе, не затрымаліся там, а чамусьці пайшлі да мяне. Ускінулі рукі да столі: «Хайль Гітлер!» Перакладчык запытаўся:

—Як доўга вы жывёце ў гэтай хаце?

—Пасьля таго, як вашыя бомбы запалілі Дом спэцыялістаў, дзе жылі раней, камісар доктар,— адзказваю я.

—Кайзер мае намер купіць вашыя пэйзажы.

—Акрамя таго, што ён бачыць на сьцяне другіх не маю. (На сьцяне кнопкамі прымацаваныя кардонкі, на якіх хуткія накідкі —эцюды).

Камісар тыкнуў пальцам на чатыры кардонкі і запытаўся : «Колькі ўсё гэта будзе каштаваць?»

Я адказваю, што ня ведаю, што і дзе можна купіць на гэтыя маркі. Доктар Кайзер паклаў на стол 70 марак і папрасіў напісаць расьпіску. Пытаюся:

—Навошта пісаць расьпіску? Можа доктар Кайзер не для сябе купляе?

—Для сябе, але яна патрэбна яму як доказ, што-б ніхто не падумаў, што ён у вас іх сьвіснуў.

Я нярвуюся, хачу хутчэй запакаваць малюнкі, рукі трасуцца. Чую, як перакладчык гаворыць:

—І калі ў вас будзе што-небудзь на душы, вы заўсёды зможыце зьвярнуцца да доктара Кайзера, ён вам паможа.

А на душы накапілася шмат чаго. Ці можна, напрыклад, падамагчы даведацца, дзе тры браты маёй жонкі, што носяць прозьвішча Галубок? Але хіба аб гэтым пытацца у таго, хто спаліў гарады, ды праліў рэкі нашай крыві. Не, прасіць ня будзем нічога і скардзіцца на Сталіна, за тое, што ён расстраляў бацьку маёй жонкі — Галубка, таксама ня станем. Хаця ўсяго слова — і мы з жонкай мелі-б шыкоўную кватэру, добрыя ўмовы жыцьця і лепшыя заказы па маёй прафэсыі.

Мабыць больш года прайшло з таго часу, калі старэйшая дачка Галубка — Багуслава мусіла выехаць зь Менска ў гарадзкі пасёлак Узда разам з маці, малодшай сястрой Мілай, з сваёю дачкою Славай і дзяцьмі Мілы — Сяргеем і Ларысай. У Менску заставацца ёй было небясьпечна, бо ўсе ведалі Галубка і тое, што Багуслава замужам за Плісанам— вядомым хірургам-дацэнтам, які яўрэйскай нацыянальнасьці. Плісан быў на фронце, а Багуславу з дачкой Славай немцы маглі кінуць у гета, як яны зрабілі з Ганнай Левінай ды зь іншымі жанчынамі, якім рабілі аперацыі— пазбаўлялі дзетараджэньня. У пасёлку Узда Галубкоў таскама ведалі, але муж Багуславы быў тут незнаёмы. Багуслава Галубок хутка ўладкавалася ў бальніцы, стала намесьнікам галоўнага лекара. Была яна па спэцыяльнасьці хірургам. Што ні дзень, то апэрацыя. Вакол Узды лясы, што цягнуліся да Негарэлава, а далей амаль да самага Менска. Умовы для партызанаў добрыя — шаша вузкай стужкаю цягнецца праз лес. Прыйшлося немцам вырубаць лясы па 50 метраў з кожнага боку, што, безумоўна, спрыяла абароне. Лекар Галубок лячыла хворых незалежна ад таго немец ён быў або партызан. Што датычыцца ўзьдзенцаў, дык яны йшлі да яе заўжды, калі патрэба была. Мая маці таксама апынулася ў гэтым гарадзкім пасёлку. Яна ўмела шыць і такім чынам зарабляла на хлеб. Разьлік ішоў натурай. Усё гэта нядзіўна, бо ў горадзе і тыдня не пражывеш без дапамогі вёскі.

Аднойчы прыйшоў да нас у хату паліцай і працягнуў паперу. Я пазнаў по-

чырк Багуславы: «Міла й я ў турме, памажыце». Далі паліцаю нейкі хабар за паведамленьне. Распыталі, што ды як. Але што рабіць далей? Ісьці да Кайзера небясьпечна, бо гэта не матэрыяльная прозьба, а палітычная. Няма надзеі, хутчэй пашкодзіш справе. Праз дні тры да нас забегла дзяўчынка. Яна зь біржы пра цы, працуе ў жаночым аддзеле. «Вашыя дзьве сястры зараз у нас на біржы, неадкладна прымайце нейкія меры, інакш, будзе позна», — папярэдж- вае яна нас.

Трэба ісьці на біржу. Апранаю летняе паліто і капялюш, бо гавораць, што шэф жаночай біржы фрау Эльжэвіц — сурьёзная жанчына. Перад яе кабінэтам сядзяць дзьве сакратаркі, адна зь іх ужо знаёмая мне. Стукаю ў дзьверы, уваходжу, здымаю капялюш, чую: «Сядайце». Перада мною жанчына ва ўніформе, ёй гадоў, мабыць, зь пяцьдзесят. Твар яе шэры, тыпічыны для астзейскай немкі: нос доўгі з гарбінкаю, малыя вочы сядзяць глыбока. Не жанчына, а паліцай ў спадніцы.

Між тым і яна глядзіць на мяне як на чалавека, які прыйшоў вядома зь якой мэтай. Пытаецца, што мяне прывяло сюды. Кажу, што я мастак і хачу пісаць яе партрэт.

— Я ўжо маю яго.

— Я ведаю пра гэта, але я напішу лепш, бо я мастак, а вас пісаў архітэктар Плеханаў акварэлю, што ні адно і тое.

—Добра, а як будзем разьлічвацца?

—Пад вашым загадам ёсьць дзве сястры маёй жонкі.

—Пойдзем, я іх вам аддам.

Хваляваньням няма канца, усё яшчэ ня веру, што забяру жанчын. Разам з фрау ўваходзім у пусты пакой. Там сядзяць схуднелыя з бруднымі тварамі мае нявольніцы з клумкамі ў руках.

—Даю вам два месяцы адпачынку, а там пабачым, — кажа Эльжэвіц.

Шчасьлівыя, мы ідзем да хаты. Па дарозе даведваюся, што сясьцёр схапілі за сувязь з партызанамі. Тады з Узды ўзялі чалавек сорак ды пад канвоем адвезьлі ў Менск. Пасьля турмы іх даставілі на мэдкамісію, каб адправіць у Нямеччыну. Добра, што ў камісіі знаёмыя лекары, беларусы, адзначылі ў дtravel ведцы, што ў Эміліі цяжарасьць, а ў Багуславы эпілепсыя. Таму і трапілі яны да фрау Эльжэвіц на біржу працы.

Фрау Эльжэвіц мела кватэру па Ўльянаўскай вуліцы ў чырвоным будынку. Там і пачаліся сэансы. Я даведаўся да ўсяго, што яна яшчэ і старая дзева, адсюль і нелюбоў да жанчын, зайздрасьць. Да таго-крыўда на Бога за твар, які не падабаўся ні ёй, ні мне, як маста ку. Але трэба рабіць усе, каб было і падабенства, і хоць крышачку прыгажосьці, інакш мае абяцаньні ня спраўдзяцца, і фрау не даруе мне падману.

У часы сэансаў да яе прыходзілі жанчыны. Хто прыносіў вялікі торт, хто пародзістых шчанятак, хто рабіў манікюр. Так адбывалася кожны раз. Нарэшце, сэансы скончыліся. Партрэт фрау спадабаўся, і яна запрасіла да сябе суседа, каб ён пацьвердзіў яе ўражаньне. Паказала яна яму таксама пэйзажы тых мастакоў, жонкі якіх вызваляліся ад фізычных і цяжкіх працаў. Фрау Эльжэвіц дзівілася, адкуль я, па манэры і почырку, пазнаю прозьвішчы аўтараў. Толькі аднаго пазанць ня здолеў. Гэта быў Клі менка, вельмі бездапаможны мастак, які аднак, як казалі пра яго, пісаў партрэт генерала СС Готвальда і на самалёце вылятаў да сваёй мадэлі на кожны з сэансаў. У вайну ўсё магло быць. Кожны немец мог памяняць найлепшую каляровую рэпрадукцыю на хуткі накідак алоўкам, абы гэта быў арыгінал. Кожны нямецкі салдат ведаў цану мастацкаму



твору, а пагэтаму яны цягнулі ўсё, што зроблена рукамі майстра. Адсюль адносіны да мастака былі лепшымі, чым да іншых.

*Успамінаецца, як па тэлебачаньню мастак Савіцкі адказваў на пытаньні вучняў: «А што было, калі-б немцы даведаліся, што вы мастак?» Савіцкі адказаў на пынаньне так: «Яны мяне-б расстралялі». Але гэта няпраўда, бо перш- наперш немцы спыталіся ці навялі спраўкі адносна нацыянальнасьці. Калі-б Савіцкі быў яўрэй, то зь ім было тое, што з Бразэрам, які меў пропуск з гета і рабіў хуткія малюнкі салдатаў або малодшых афіцэраў за бохан хлеба ці банку кансэрваў. Потым, калі гестапа ўзяло яго да сябе, ён бесперапынку маляваў усіх, хто хацеў. А пасьля яго пусьцілі ў расход. Трэба заўсёды помніць, што вермахт — нямецкая армія — гэта не адно і тое, што СС ці СД , ці гестапа. Армейскія афіцэры, салдаты і самі не вельмі любілі гэтыя гітлераўскія арганізацыі. Савіцкі да вайны нідзе не займаўся і ніякім мастаком яшчэ ня быў. Ён трапіў у Нямеччыну як остарбайтэр-рабочы з Усходу па набору беларускай моладзі для працы на вёсцы. Працаваў ён у бауэра (селяніна) на гаспадарцы, як і другі наш мастак — Казей. Той таксама яшчэ нідзе не вучыўся на мастака, але быў як і Савіцкі, здольны з маленства хлапец.*

Той, хто добра ведае немцаў у роз ных умовах, у рознай якасьці, ня будзе з усіх іх рабіць ворагаў з фашысцкай афа рбоўкай, а таксама разглядаць як камуністаў ці антыфашыстаў. Успамінаю Петэ ра Грэйвена, інжынера стройбатальё на, які мяне папярэджваў, каб я ніколі не расказваў, як немцы ў адзеньні нашай міліцыі скідваліся на парашутах у натоўпы менскіх уцекачоў, каб рабіць паніку («Цябе, Джэні, могуць схапіць і расстраляць, як сьведку парушэньняў міжнароднае канвэнцыі, што забараняе пераапранацца ў ваеннае адзень не супрацўніка»). Петэр Грэйвен піхаў мне ў кішэні хлебныя галеты для майго маленькага сына Генрыха. Калі я прыходзіў да яго, ён абавязкова карміў мяне і даваў з сабою, бо ведаў, што я без перапынку хачу есьці і думаю аб сям'і. Ён быў ня толькі добры чалавек, але і меў свае погляды на вайну, на тое, што Гітлер хоча выглядаць як вызваліцель, а з другога боку вядзе тэрор сярод неві ноўных людзей, вешае іх, як партызанаў, на кожным тэлеграфным слупу.

Аднойчы Петэр запытаўся ў мяне:

—Ці бачыў ты фільм «Дыктатар»?

—Не, але ведаю, што стужка гэтая была закупленая. Але не пайшла ў пракаце, бо дыктатар быў вельмі падбоны на Сталі-на. Не па зьнешнасьці, а па дзейнасьці.

—Хочаш, мы табе пакажам яе, вядома, пад сакрэтам?

—Не, бо не хачу нечаканасьцей, у маім стане гэта небясьпечна.

Фільм быў карыкатураю на абодвух дыктатараў, і аб гэтым ведалі ня толькі нямецкія камуністы, але і ўсе салдаты вермахта. Часта немцы рабілі параўнаньне паміж Гітлерам і Сталіным: «У вас Правадыр—у нас Фюрэр. Але чаму вашыя сябры партыі не маюць партыйнай вопраткі і партыйных знакаў? Ці не таму, каб ніхто ня мог сказаць тое, аб чым ду мае ўслых, бо сярод прысутных ёсьць сябра партыі, а ніхто аб гэтым ня ведае». Яны не маглі паверыць у тое, што дрэваапрацоўчы завод імя Молатава ў Менску толькі носіць імя Молатава, а не зьяўляецца ягонай уласнасьцю. Як прыклад у сябе, называлі Герынверке — заводы Герынга, якія былі сапраўды ягонай ўласнасьцю. Аднойчы, адзін партайгеноссэ, паказваючы на сваю вопратку, а

потым на партыйны значок, сьвярджаў, што гэта ўсё хлеб. Ён нават не саромі́ўся таго цынізму, бо лічыў па сабе, што і ў нас ідуць у партыю, бо яна дае усё, чаго ня маюць беспартыйныя. «Мы хочам жыць добра зараз, а ваш камунізм — гэта мары, якія залежаць ад сусьветнай рэвалюцыі, якую цяжка дачакацца ў адно жыцьцё чалавека». Нем-цы казалі так: «Гітлер дае нам працу, дае пазыку на пабудову ўласнага дома, ён ліквідаваў беспрацоўе. А каб жыцьцё было яшчэ лепш, трэба пашыраць жыцьцёвыя прасторы за кошт Расеі, у якой іх занадта». Усё так і адбывалася, як было ў кнізе Майн Камф. Можа вельмі спрошчана, але для звычайнага немца больш і ня трэба. Колькі разоў бачыў, як салдат ці тылавы немец даставаў з кішэні фота, дзе яго дзеці, яго хатка і ён сам з жонкай у агародзе калупаецца. Чаго больш трэба для жыцьця? Яму хапала, а ўсё астатняе патрабавала дзяржава, якая даўно мела патрэбу ў жыцьцёвай прасторы.

Пасьля таго, як савецкія войскі пагналі немцаў з Смаленска, у Менску актывізавалася гестапа, а разам зь ім і гарадзкія нямецкія ўлады, якія распалялі нацыяналістычныя спрэчкі сярод беларускага насельніцтва. Яны казалі, што партызаны, бальшавікі адпомсьцяць за тое, што ты супрацоўнічаў з немцамі ці, наогул, заставаўся нейтральным. Яны ведалі, чым запалохаць нашу інтэлігенцыю, спасылаючыся на рэпрэсіі 30-х гадоў, калі па аднаму толькі даносу хапалі людзей без суда і сьледства. Цяпер-жа за працу ў немцаў кожнага чакала куля ў патыліцу. Пачаліся правакацыі, такія моцныя і хітрыя, што нельга было зразумець, зь якога боку яны ідуць, і хто гэтым займаецца.

Вядомы кампазытар Туранкоў апынуўся ў акупаваным Менску і мусіў не паверыць тым людзям, якія называлі сябе партызанамі і прапаноўвалі яму бясьпеку. Яны хацелі пераправіць яго ў лес да партызанаў, а затым на самалёце ў Маскву. Туранкоў ня даў згоды, палічыў, што гэта звычайная правакацыя. Ня так лёгка было зьбегчы вядомаму чалавеку, ды пры тым не адному,а зь сям' ёй. Зараз некаторым цяжка паверыць, што абставіны ў той час былі такія, што даўно вядомы табе чалавек мог быць зусім ня тым, кем ён быў раней. Асьцярожнасьць была патрэбна ўсюды і кожнае слова патрабавала абдумоўваньня.

Як я ўжо казаў, загадчыкам аддзелу мастацтва быў Панін, а яго намесьнікам малодшы брат Алеся Ільінскага, славутага артыста камэдыйнага жанру (у канцы жыцьця народнага артыста СССР). Панін быў музыказнаўцам, добра ведаў нямецкую і французкую мовы. Ён прыйшоў да немцаў у чырвонаармейскім адзеньні — здаўся добраахвотна ў палон. Як інтэлігент, ён больш падыходзіў да аддзелу мастацтва. Таму стаў намесьнікам шэфа ва Ўправе. Казалі, што Ільінскі быў або журналіст, або пісьменнік. Меў ён зьнешнясьць вельмі падобную на яўрэйскую, трохі ведаў нямецкую мову і добра беларускую. Відаць, ня толькі зьнешнясьць Ільінскага, але і нешта іншае давалі Паніну мажлівасьць чапляцца да яго, маўляў, ня месца жыдам у аддзеле мастацтва. Паміж імі пачалася грызьня. Адразу скажам, што Панін меў перавагу над Ільінскім у тым, што немцам ня трэба ніякіх доказаў,— скажы пра любога, што ён яўрэй і гэтага хопіць, каб закатаваць чалавека. Аднойчы Ільінскі зайшоў да маці Круталевіча, каб тая стала сьведкай і змагла даказаць, што ён не яўрэй. Тая была знаёмая зь яго бацькам, але, здаецца, яна нікуды не пайшла, бо была старой і хворай жанчынай. Што сталася



далей зь Ільінскім мне невядома, але казалі людзі, немцы закатавалі яго.

У Менску апынуўся архітэктар Пляханаў, які, вядома, нічога не будаваў, але, як валодаўшы тэхнікай акварэлі, рабіў партрэты немцаў з Генеральнага Камісарыяту. Ён так разбэсьціўся і заznаўся, што пачаў сварку зь немцамі ў час ў п'янай вакханаліі, дзе і быў застрэляны там-жа на месцы.

Успамінаецца яшчэ прозьвішча кампазытара Шчаглова, які зьявіўся ва Ўправе, здаў свой ордэн Знак пашаны, што атрымаў на першай беларускай дэкадзе літаратуры і мастацтва ў Маскве. Рабілася, як казалі, усё добраахвотна, па маладосьці і глупству. Бегчы зь Менску прыйшлося абавязкова, бо зарана вырашыў, што бальшавікі больш ня вернуцца ніколі.

Малады кампазытар Кляус скарыстаў сваё яўна нямецкае прозьвішча і падаўся да немцаў. Яны далі яму хату (былую яўрэйскую). Калі савецкія войскі бліжэй націснулі да Менску, то ён мусіў бегчы ў Германію з усёй сям'ёй. Напярэдадні ён зайшоў да нас, каб запаліць печ (Кляус з лушпінаў бульбы рабіў рассаду) і пачаў размову наконт ад'езду. Ён разважаў так: трэба абраць краіну, дзе будзе больш кароваў, чым людзей, і гэта мусіць быць Галандыя. Але, відаць, Кляус нешта не разлічыў і папаў у зону акупацыі Германіі савецкімі вайскамі, а такія ўцекачы заўсёды адсылаліся ў тыя гарады, скуль яны беглі зь немцамі. Рабілася гэтак таму, каб лягчэй было дазнацца , чаму бег чалавек ад сваіх вызваліцеляў, якія абставіны прымусілі яго пайсьці на гэтае.

Памятаю, як у канцы сьнежня 1945 г. нехта пастукаў у нашую хату позьнім халодным вечарам. Калі адчыніў дзьверы, убачыў Кляуса, яго жонку, дачку, якой гадоў 7 і бацьку жонкі, якому было пад 60. Кляус пачаў гаворку з таго, што хата належыць зараз пляменьніцы, і ён думае, што мы павінны пакінуць гэты дом. (Сп-я Круталевіч памерла яшчэ пры немцах, яе пахавала пляменьніца, якая і стала гаспадыняй гэтай хібаркі). Ён прапанаваў, каб мы шукалі сабе памешканьне ў Менску, як быў разбураны ўшчэнт і ў якім захаваліся толькі драўляныя застройкі прыватных дамоў. На маё шчасьце, вярнулася жонка, і спакойна растлумачыла, што па савецкіх законах пляменьніца ня мае права спадчыны, а толькі дзеці, падругое, мы адкупілі гэтую хату ў Варашылаўскім райвыканкаме, бо яна доўгі час заставалася без гаспадара. Кляусам лягчэй чым нам можна было знайсьці кватэру, іх ўсе ведалі ў гэтым раёне. Гэтак і сталася, у канцы завулка, у хаце з чатырмя пакоямі ім далі палову. Мы-ж з свайго боку перадалі ім усе рэчы, якія належалі нябожчыцы. Праз нейкі час Кляуса арыштавалі й адаслалі некуды адбываць пакараньне.

Так не пашчасьціла Кляусу, але пашанцавала мастаку Міколе Пашкевічу, які з жонкаю мастачкай Галінай Дакальскай і яе маткай ды яшчэ з пляменьніцай, дачкой актрысы Веруты Дакальскай, перабраліся спачатку ў Вільню, а потым у Коўна.

(Працяг у наступным нумары)



# «Зыйшоўшы крокаў некалькі...»

Янка Юхнавец



Хаця Янка Юнавец — майстра верша, але ёсьць сярод яго здабыткаў і празаічныя творы. Ягоныя апавяданьні ў розныя часы друкаваліся ў шматлікіх выданьнях, але асобнымі зборнікамі не выходзілі.

Рэдакцыя часопіса «Полацак» віншуе Янку Юхнаўца зь юбілеям і зычыць яму здароўя, выкананьня ўсіх задумаў, доўгіх і творчых гадоў жыцьця.

Прапануем чытачам некалькі вершаў паэта.

70 год назад, 3 лістапада 1921 года на Бягомельшчыне (Докшыцкі раён) нарадзіўся Янка Юхнавец.

У 1948 годзе ў часопісе «Шыпшына» ўпершыню былі надрукаваныя вершы Юхнаўца. Потым яго мэтафізычныя, не зусім традыцыйныя, але шчырыя, як ад споведзі, вершы пачалі зьяўляцца у часопісах «Сакавік», «Конадні» й іншых эміграцыйных выданьнях.

У 1953 годзе ў выйшла першая кніга паэзіі Янкі Юхнаўца. Яна мела назоў «Шорах Моўкнасьці». «Новая Элэгія» была надрукавана ў Баварыі ў 1964 годзе. Зборнік «Калюмбы» пабачыў сьвет у 1967 годзе.

Самая апошняя трохкніжная зборка вершаў пад назовам «Творы» датуецца 1989—1990 гг. Многія творы Янкі Юхнаўца былі перакладзены на ўкраінскую мову паэтам Л.Палтавай.

Зыйшоўшы крокаў некалькі з узгорку
апынішся на скрайку даўніны тваёй:
там струмяніць усё аблітая крывёй
Няміга вузкая, нібы ў надвячорку

сутоніць водгуль далёкае паходні.
Там прывідам вітальных
стогнаў захаплёны
мройны мір ня цісьнець грудзі плёнам:
спагаднае прымі жыцьцё,
як ёсьць на сходні

пакуты вашае, цярпеньняў і пагардаў.. .
Плыві, Няміга! У збытку поеныя
патокам скрух
скарынку хлеба богам не прыкліваюць.
Свабоды зайздоасьці ня цешацца
прычасьцяй скаргаў,
як чуткі досьвіткам -
так кволяць хвалі слых,—
грахамі усялякамі... і добрымі
мы баім іх.



## Сакратава

Ціхінь мінулая -разьмёты крылаў асьцярожныя
тайніцай атулі разгаданай ня імі.
Існасьці вускрос карэньнямі даўгімі
забяры граніт і часьлінкі душы парожнай.

Шчэ пакідаецца шмат месца для жахлівага.
І можа паважаць было - знаходзіць сваю рату.
Нясуць атруту — даўгі за некага. Караюць за віну:

напэўна кату
што ўчора споўдаўся, нікім ня гнаны,
прысьніўся дзень і грош не зарабляны.

## Хрышчэнцы

Хадзем. Акрыяў я. Якраз у час
старасьць надыйшла як і маё маленства.
будзе люба ўсё. Жаданьне кажнае уразіць нас,
аддаючы крыві моц блізкага наўцемства:

хрышэнцамі хадзем да сьлепасьці вякоў—
там гімны моўкнасьці, як скорсьць, што любіць вартасць—
сьвет палоханы чым-небудзь зноў
у просьбы кідаецца, тайкуючы ўпартасьць.

І толькі даўшы ўбожану, тады
паверым собскай моцы пераможца.

Усяк унімемся трывогамі сваімі —
даляву якую кроў не апалошча...
Жыцьцё ясьніць нат кроплямі малымі.
Пытаешся: —Ці жыць хоць шчасьцямі благімі?

# Маісеевы законы

Масей Сяднёў

*( З цыклу біблейска-гранічныя вершы)*

*Вуснамі свайго памазаньніка Маісея Бог апавясьціў*
*цэлы кодэкс законаў-пастановаў.*
*Сярод іх закон пра нявольнікаў,*
*закон пра пашкоджаньні чалавеку,*
*закон пра кражу, закон пра ўдоваў і сірат,*
*закон пра дзяўчыну і шмат іншых законаў.*

*У законе пра дзяўчыну, напрыклад, сказана:*
*калі хто сапкусіць неабручоную дзяўчыну*
*і перасьпіць зь ёй, мусіць узяць яе*
*сабе ў жонкі.*
*Закон гэты паўсюдна ў нас парушаецца:*
*спакусяць, перасьпяць, а ў жонкі не бяруць.*

*У законе пра ўдоваў і сіратаў сказана:*
*Ні ўдавы, ні сіраты ня крыўдзіце.*
*Калі ты пакрыўдзіш іх і яны паскардзяцца Мне,*
*Я пачую іхную скаргу, і гнеў мой выбухне,*
*І засяку Я мячом вас, і будуць жонкі вашы,*
*і дзеці вашы ўдовамі і сіратамі*

*Калі-ж пачуе Усявышні скаргі*
*удоваў і сіратаў на зямлі беларускай?*

## Лесьвіца

*Біблейскі Якаў убачыў у сьне лесьвіцу.*
*Яна, стоячы на зямлі, датыкалася*
*сваім верхам неба.*
*Па ёй спушчаліся і ўзбіраліся назад*
*Божыя ангелы.*
*Добра, што гэта быў толькі сон.*
*Калі-б гэта было на самай справе так,*
*па лесьвіцы ўзабраўся-б на неба ні адзін хам.*



## Божая міласьць

Бог усё-ж быў міласьцівы
да дачок чалавечых:
загадаў Ною ўзаць і іх
у каўчэг да сябе,
каб яны не загінулі ў патопе.
Інакш — што рабілі-б тады
сыны Божыя?

## Шматстайнасьць

Некалі на зямлі была адзіная мова.
адзіны дыялект, і людзі добра разумелі
адзін аднога.
У адзінстве і паразуменьні яны пабудавалі
у зямлі Сэнаарскай вялікі горад і вежу
да самых нябёс.
Ды Богу не спадабалася аднастайнае адзінства:
Ён стварыў сьвет шматстайным.
Узяў і зьмяшаў там мову, каб не разумелі
мовы іншага. Расьсееў іх па ўсім сьвеце,
і яны перасталі будаваць горад.
Вежа распалася. Але замест аднэй,
адзінай мовы, зьявілася на сьвеце
шмат моваў, у тым ліку і беларуская.

## Міласэрная Сара

У Сары, жонкі Аўрама, ня было дзяцей —
не раджала. Так захацеў Бог.
І Сара сказала свайму мужу:
ты ведаеш, я не магу раджаць,
вазьмі маю служанку і ўвайдзі ў яе.
Дала яму сваю служанку, эгіпцянку Агар.
І Аўрам ўвайшоў у яе. Служанка зацяжарыла
і нарадзіла яму сына Ізмаіла.

Надзвычайная гісторыя.
Сучасныя нашыя Сары, нажаль, не такія міласэрныя.

1991 г.




## «Заціхніце, мукі каханьня...»
### Сьвятлана Белая

У час вячэрні шэра-ружаваты ў ціхай старасьвецкай хаце Какуевых гучала «Месячная саната» Бэтховена. Слухачоў сабралося няшмат: Максім, Добік, браты Рафаіл і Мікалай Какуевы, сястра Ані Варвара й яе цётка Тацьцяна Рафаілаўна. Вясёлы і трывожны гук раяля роўнай дарожкай разьліваўся па вялікай залі і старому, падобнаму на парк, саду. Аня хадзіла ў лепшых вучаніцах Яраслаўскай жаночай гімназіі, апякункаю якой была Праскоўя Аньціпава. Гэтая прывабная, на рэдкасьць таленавітая мэцэнатка, зрабіла ўсё, каб яе гімназісткі змаглі атрымаць добрую адукацыю. У гімназіі выкладаліся музыка, жывапіс, літаратура, замежныя мовы. Сьцены клясаў упрыгожвалі творы вядомых мастакоў і графікаў, якія ўсё жыцьцё зьбірала Аньціпава. (Яе багатая калекцыя паклала пачатак Яраслаўскаму мастацкаму музэю, які быў створаны ў сьнежні 1908 г.) Сёстры Какуевы вылучаліся сярод сваіх сябровак ня толькі прыгажосьцю. Варвара цудоўна малявала. Аня была здольная да замежных моваў, коннай язды й музыкі. Выкладчыкі гімназіі прадказвалі ёй будучыню піяністкі, але дзяўчына толькі зь усьмешкай слухала іх прароцтвы. Яна, як і некалі яе маці, шчыра любіла музыку. Аня проста жыла ёю.

Тонкія пальцы перабіралі клавішы раяля, і кожны яго гук адбіваўся у душы Максіма. Яму здавалался, што ён бачыць чароўны сон. Разам з музыкай набягалі хвалямі шчасьця радкі.

*Ўчора шчасьце толькі глянула нясьмела,*
*І развеяліся хмары змрочных дум,*
*Сэрца чулае і млела, і балела.*
*Радасьць душу мне шчаміла, быццам сум.*
*Ўсё жыцьцё цяпер, як лёгкая завея,*
*Кнігу разгарнуў — а не магу чытаць.*
*Як зрабілася, што пакахаў цябе я,—*
*Хіба знаю я? Ды і нашто мне знаць?*

І хаця саната скончылася, ад яе «*шчэ доўга веяў пах, як ад цьвятка*». Максім ня мог надыхацца тым музычным водарам. Аб гэтым ён і хацеў сказаць Ані, калі падыйшоў да яе. Юнак заглянуў у яе чорныя, як ноч, вочы і — разгубіўся. Гэта былі іншыя, зусім ня тыя, што толькі што глядзелі ў ноты, вочы. У іх жыў сум і незразумелая яму таямнічасьць. Але яны пацяплелі, калі ён пачаў гаварыць. Можа таму, Максім, пачырванеўшы, нарэшце, прызнаўся: «Калі вы гралі, Ваш вобраз адбіваўся на крышцы раяля. Але згіне адтуль ваш вобраз і сьледу ня кіне. А ў маёй душы яму ўжо ня згінуць». Маўчаньне панавала ў залі. Ён зразумеў, што сказаў тое, чаго нельга было зараз казаць. І адчуваючы, як сэрца моцна забілася ў грудзях, амаль выбег з пакоя.

Потым яны сядзелі на прыгожай верандзе і пілі духмяную гарбату з яблычным варэньнем. Аня была побач, і калі яе тонкая рука крышку дакраналася да ягонай, ён адчуваў сябе самым шчасьлівым на зямлі. Ён ня чуў, аб чым гаварылі навокал. Не разумеў, з чаго рагочуць сябры. Максім бачыў толькі Аню.



Як праз нейкую заслону далятаў голас Тацьцяны Рафаілаўны. Здаецца, яна нешта расказвала пра Шаляпіна. Нечакана цётка зьвярнулася да Максіма: «А Вы, малады чалавек, бывалі калі-небудзь на канцэрце Шаляпіна?» На пытаньне трэба было адказваць.

—Так, і не аднойчы. Мы тады ў Ніжнім Ноўгарадзе жылі, а Шаляпін у гэты час даваў там канцэрты. Наш сваяк Максім Горкі пасябраваў зь ім, і сьпявак перабраўся на яго кватэру. Мы амаль кожны дзень прыходзілі ў госьці да Горкага паслухаць Шаляпіна. Перад канцэртам той абавязкова меў рэпэтыцыю. У час, калі ён сьпяваў, каля хаты зьбіраліся людзі. Слухачы прасілі, каб мы адчынілі вокны. І сьпявак з ахвотай рабіў гэта.

—О, так Вы асабіста былі знаёмы з славутым сьпяваком? — дзівіцца жанчына.— А хто, калі не сакрэт, вам будзе Максім Горкі? Ведаеце, я зь цікавасьцю чытаю ягоныя апавяданьні. Некаторыя зь іх напісаныя вельмі жвава.

—Ягоная жонка, Кацярына Паўлаўна Волжына, была роднай сястрой маёй мачыхі.

—Пэўна, і Вы самі вядомым чалавекам станеце, калі ў вас такое сваяцтва,—сьмяецца Тацьцяна Рафаілаўна. — Глядзі, Анечка, некалі і ты будзеш усім расказваць, што цябе слухаў Максім Багдановіч. Што-ж я вельмі рада, што Вы наведалі наш дом. Спадзяюся, што малады чалавек будзе нашым частым госьцем

Так пачалася самая шчасьлівая Максімава вясна. Вясна яго каханьня. Амаль кожны дзень ён прыходзіў у гасьцінны дом Какуевых. У ім заўсёды было ўтульна і па-хатняму цёпла. Зь цяністага адзічэлага сада, дзе без усякага парадку расьлі шыпшына і клён, чарэшнявыя кусты і тонкі хмель, — веяла кветкамі і яблыкамі. Вясной пакоі поўніліся тонкім водарам ябланевых пялёсткаў. Летам — пахучымі пладамі антонавак, ранетак. Двор, як і сад, быў вялікі. Тут заўсёды йшлі спрэчкі: хто самы спрытны, дакладны ў гульнях, самыя любімыя зь якіх— лапта і гарадкі. Вечары ператвараліся для ўсіх у сапраўдныя сьвяты. Потым, у сваёй паэме «Вераніка», Максім Багдановіч так успомніць той незабыўны час:

*Вясёла йшлі гулянкі нашы:*
*Пад шум і гук размах рукі*
*Збіваў здалёку гарадкі,*
*Быў чутны смех пры відзе «кашы»,*
*І кожны стрымываў свой плач,*
*Калі ўразаўся ў плечы мяч.*
*А вечарком мы выпускалі*
*Ў паветра белых галубоў.*
*Зрабіўшы некалькі кругоў,*
*У вышыню яны шыбалі,*
*Як чысты сьнег, кружылі там*
*і падалі на дахі к нам.*
*Калі-ж сачыўся бледнаваты*
*Зор сініх сьвет праз небасьхіл*
*І уплятўеся вулак пыл.—*
*Мы ўсе пяялі каля хаты,*
*І напаўняў нягучны хор*
*Маркотнай песняй сьціхшы двор.*

Максім, безумоўна, прыходзіў да Какуевых ня толькі, каб пагуляць у гарадкі або пагаманіць зь сябрамі. «*Усё адна цяпер мне думка сэрца душыць, Як пабачыцца з табой, к табе прыйсьці. А палын-трава няхай сабе заглушыць Пазабытыя даўнейшыя пуці*», — прызнаўся ён Ані ў адным з сваіх вершаў. Кожнае *спатканьне* зь ёю прыносіла яму такую вялікую радасьць, што яна не магла зьмясьціцца нават у ягоных вершах.Аня стала самым дарагім і блізкім яму чалавекам.

Вясна Максімава каханьня праляцелі хутка. Зайграла восень свой разьвітальны залаты вальс, і заплакала лета, зямлю пакідаючы. Пачаліся заняткі ў гімназіі і пра гульні прыйшлося забыцца. Максім стаў усё радзей прыходзіць да Какуевых. Ён спадзяваўся на новую вясну, але ягоным марам не суджана было збыцца. Пасьля заканчэньня гімназіі, ён пае-

хаў на Бацькаўшчыну. Калі вярнуўся, Ані зноў не было ў Яраслаўлі. Так іх шляхі і разьмінуліся. Яна паступіла ў Пецярбургскую кансэрваторыю, ён — у Яраслаўскі Дзямідаўскі ліцэй.

Максім ніколі не думаў аб ліцэі. Рэдакцыя «Нашай нівы» даўно дала яму рэкамэндацыю на кафэдру прафэсара Шахматава ў Пецярбургскі унівэрсытэт. Але бацька і слухаць не хацеў пра філёлягічны факультэт:

—Сваім беларусазнаўствам ты зможаш займацца і ў Яраслаўлі. Не абавязкова для гэтага ехаць у Піцер. Для жыцьця трэба мець такую прафэсію, якая дала-б верны кавалак хлеба.

Потым ужо больш спакойна, бацька казаў Максіму:

— Пецярбург — горад не для твайго здароўя. Туманы, дажджы, заўсёды вільготнасьць. Ты і дома, у цёплай, натопленай хаце, пры добрым харчаваньні, то кашаль, то яшчэ якую хваробу схопіш. А што будзе там? І хто стане даглядаць за табой, калі ты, не дай Божа, захварэеш?

Адам Ягоравіч гаварыў доўга. Прыводзіў розныя доказы. Але Максім стаяў на сваім. Нарэшце, бацька сказаў:

—Не змагу я адначасова цябе і Лёву вучыць ва ўнівэрсытэтах. Ты-ж ведаеш, твой брат пасьля гімназіі паедзе ў Маскву. Пашкадуй ты нас, Максім, заставайся ў Яраслаўлі. Паступіш у Дзямідаўскі ліцэй. Будзеш судзьдзёй або юрыстам...

Максім у запале тады сказаў: «Пракурорам быць не хачу. Адвакатам і судзьдзёй таксама. Хачу быць літаратарам або вучоным». Але прыйшлося падпарадкавацца бацьку. Нягледзячы на тое, што жаданьне прысьвяціць сябе вывучэньню беларусікі, з кожным днём станавілася ўсё мацьней.

Прыгожая форма ліцэіста зь бліскучымі гузікамі і форменнай тужуркай. У кішэні — новенькі гадзіньнік, які бацька падарыў з нагоды заканчэньня гімназіі. Максім—ліцэіст. Гучыць гучна і чамусьці Царскасельскі ліцэй прыгадваецца. Можа таму, што там таксама выхоўвалі вальнадумцаў, праўдашукальнікаў і дзекабрыстаў.

Яраслаўскі ліцэй працягваў гэтую традыцыю. Неаднойчы тут разгараліся студэнцкія хваляваньні, пасьля якіх звычайна адбываліся арышты. Ці мог прадбачыць падобнае праўнук вядомага багацея Мікіты Дзямідава, калі ў 1805 г. адчыняў на свае сродкі ліцэй? Праўда, тады ён называўся інакш: Вышэйшае навук вучылішча. Потым яно пераўтварылася ў камэрцыйны ліцэй, а 30 жніўня 1870 года, каля пасьля судовай рэформы тут пачалі выкладаць юрыдыкцыю, адбылося ўрачыстае адкрыцьцё юрыдычнага ліцэю.

З гэтага часу па сутнасьці і пачынаецца яго гісторыя. Хаця ён рыхтаваў будучых вартаўнікоў закону, але навучэнцы самі неаднойчы парушалі яго. Асабліва у пачатку XX ст. Студэнцкія сходкі, мітынгі, дэманстрацыі сталі звыклай зьявай. Максім быў сьведкам адной зь іх. Неяк вяртаючыся зь сябрамі зь гімназіі, ён убачыў групу студэнтаў, якія зь песьнямі шлі на Стрэлку. Сябра Максіма па клясу расказаў, што дзямідаўцы выйшлі на вуліцу ў знак пратэсту супроць выхадкі аднаго з прафэсараў. Прымаючы ў ліцэістаў экзамен, ён пачуў на карыдоры рогат і вясёлую размову. Выкладчык палічыў, што ў такой атмасфэры ён ня зможа далей працягваць экзамен. Таму сабраўся і пайшоў дахаты. Абураныя студэнты вырашылі арганізаваць мітынг. Але атрады коннай і пешай паліцыі не далі ім нават пачаць яго. Ліцэісты сабраліся зноў, на наступны дзень. На гэты раз іх было больш, бо да іх далучыліся ліцэісты іншых курсаў і некаторыя гімназысты. Але Максім ні ў гэтых, ні ў іншых падзеях не ўдзельнічаў. Ён больш не марыў стаць палітычным лідэрам. Беларусіка захапіла яго поўнасьцю. А паступіўшы ў ліцэй, юнак наогул адыйшоў ад палітычнай барацьбы.

Максім рэгулярна хадзіў на заняткі. Толькі сябры па курсу бачылі яго не заўсёды. Не, ён паважаў выкладчыкаў ліцэя, якія акрамя ўсяго вялі вялікую асьветніцкую працу і разам з студэнтамі ладзілі канцэрты і спэктаклі, на якіх зьбіралася шмат гледачоў і... паліцыі, бо часьцей за ўсё ў ліцэі чыталіся забароненыя цэнзурай творы. Максіму падабаліся многія з гэтых самаахвярных людзей. Але вось да навук, якія яны выкладалі, у яго ніякай цікавасьці не было. Адзінае, што суцяшала, так гэта сыстэма, па якой ацэньваліся веды ліцэістаў.

За адказы выстаўлялася толькі «вельмі здавальняюча», «здавальняюча» або «нездавальняюча». Таму па новых правілах, уведзеных у 1906 г., званьне кандыдата юрыдычных навук прысвайвалася і ліцэістам зь вельмі сьціплымі вучэбнымі посьпехамі. Максіма гэтае задавальняла, бо заставаўся час для любімай справы. Адсідзеўшы на адной большменьш цікавай лекцыі, ён ішоў у ліцэйскую бібіліятэку, якая па колькасьці юрыдычнай і гістарычнай літаратуры, каштоўнасьці выданьняў лічылася адной зь лепшых сярод вышэйшых установаў Расеі. Да яе фондаў зьвярталіся вучоныя галоўных унівэрсытэтаў. І ня толькі па юрыдычных пытаньнях, але і па краязнаўству, этнаграфіі, фальклёру. Сюды паступалі ўсе цэнтральныя часопісы і газэты, якія бацька Максіма не выпісваў. Прыходзіла і новая мастацкая літаратура.



Яраслаўскі Дзямідаўскі ліцэй. Перад ім храм Усьпеньня.

Максім амаль увесь час праводзіў тут. Хіба маглі цікавіць яго такія навукі, як тое-ж права: дзяржаўнае, адміністратыўнае, крымінальнае, царкоўнае, фінансавае, міжнароднае, рымскае, грамадзянскае і г.д.? Або грамадзянскае судаводства, гісторыя філязофіі права, судовая мэдыцына, якія выкладаліся ў поўным аб'ёме юрыдычных факультэтаў унівэрсытэтаў. Праўда, вывучалася ў ліцэі і гісторыя расейскай літаратуры, усеагульная гісторыя, нямецкая і француская мовы. Але гэта-ж была кропля ў моры. Таму вучоба не задавальняла Максіма. Ад смутку не ратаваў і моцны прафэсарскі склад кафэдраў, якім ганарыўся Яраслаўскі Дзямідаўскі ліцэй. У свой час тут выкладаў вядомы расейскі пэдагог К. Ушынскі. Кафэдру гісторыі расейскага права ўзначальваў буйнейшы гісторык права Ўладзімірскі—Буданаў. Лепшыя пэдагагічныя традыцыі ў ліцэі ашчадна зьберагаліся. Але яны Максіма не цікавілі, хаця на лекцыях двух выкладчыкаў ён прысутнічаў амаль заўсёды.

Гісторыю расейскага права выкладаў Валерыян Шыраеў. Гэты высокаадукаваны чалавек, акрамя юрыдычных пытаньняў цікавіўся расейскай гісторыяй. Максім ведаў аб ім ад свайго настаўніка Парфірыя Мізінава, зь якім сябраваў Шыраеў, і таму яшчэ да паступленьня ў ліцэй сачыў за яго артыкуламі ў газэце «Голос». Шыраеў лічыўся асобай перадавых ідэй. І яго лекцыі вылучаліся неардынарным поглядам на тыя працэсы, што адбываліся ў Расеі. Ён марыў аб пераўтварэньні ліцэя ва ўнівэрсытэт і гэтае пытаньне ня раз падымаў на старонках газэт. Максім падзяляў думку свайго прафэсара. На жаль, іх мара споўнілася толькі ў лістападзе 1918 г. Валерыян Шыраеў, былы выпускнік ліцэя, стаў І-м рэктарам Яраслаўскага ўнівэрсытэта

Другі выкладчык, лекцыі якога Максім стараўся не прапускаць, быў дырэктар ліцэя Уладзімір Шчаглоў. На занятткі, якія ён вёў па дзяржаўнаму праву і ўсеагульнай гісторыі, усе студэнты хадзілі з ахвотай. Лекцыі прафэсара Шчаглова заўсёды выклікалі бурныя спрэчкі. Яговыя навуковыя артыкулы друкаваліся ў ліцэйскіх часопісах «Временник Демидовского юридического лицея» і ў «Юридической библиографии», адзіным у Расеі юрыдычным бібліяграфічным часопісу, які разам з «Юридическими записками» выходзіў ў ліцэі. Шчаглоў быў таленавітым літаратарам. Яго кніга «Высшее учебное заведение в г. Ярославле им.Демидова» карысталася папулярнасьцю сярод ліцэістаў. Тыя часта любілі на лекцыі задаць прафэсару пытаньне не па тэме. Напрыклад, што адбывалася сёньня дзесяць гадоў назад? Прафэсар, трошкі падумаўшы, адказваў: «10 гадоў назад у гэты дзень быў падпісаны загад на зацьвярджэньне стыпэндыі імя стваральніка расейскага тэатру Фёдара Воўкава.» Для студэнтаў гэта была толькі зачэпка, каб пачаць гаворку аб тэатральных навінках. Да іх размовы падключаўся і сам прафэсар. І гутарка пра культуру магла працягвацца гадзінамі.

Такія размовы Максім любіў. У ліцэі ў яго не было блізкіх сяброў. Яго аднакурснікі больш цікавіліся пытаньнем: кім лепш стаць пасьля заканчэньня ліцэя: юрыстам практыкам або тэарэтыкам. А Максіма гэтая праблема не хвалявала. Пасьля сваёй паездкі на радзіму ён па-сапраўднаму адчуў сябе беларускім паэтам і сваю будучыню зьвязваў толькі зь літаратурай. Вучобу ў ліцэі юнак разглядаў толькі як вымушаны крок. Шкода было часу, які прыходзілася адрываць ад сваёй беларусікі на вывучэньне юрыдычных дысьціплінаў.



Акрамя таго, нямала гадзінаў займала праца у бібліятэчнай камісіі, сябрам якой яго выбралі ліцэісты. Супакойвала тое, што ён мог у першую чаргу карыстацца фондамі бібліятэкі, першы знаёміцца з навінкамі.

Звычайна Максім шукаў зборнікі па этнаграфіі, фальклёру. Народная творчасьць беларускага народу даўно цікавіла яго. Хаця ў яго бацькі, які ў свой час займаўся этнаграфіяй, была добрая падборка кніг па фальклярыстыцы, у ліцэйскай бібліятэцы, гаратаючы зборнікі вясковых прыпевак расейскіх губэрняў, зборнікі песень і казак, Маскім яшчэ раз упэўніўся, наколькі багатая спадчына яго народу. І таму, уводзячы ў беларускую паэзію тэмы і матывы заходнеэўрапейскай і сусьветнай літаратуры, ён лёгка знаходзіў у роднай мове мастацкія сродкі для перадачы тых матываў. А яшчэ ён цьвёрда пераканаўся: нельга разьвіваць чужое, не разьвіваючы свайго. Потым тыя думкі, што прыходзілі ў час працы ў бібліятэцы, знайшлі сваё адлюстраваньне ў яго літаратурнакрытычных працах. *«Як кожны народ мае сваю нацыянальную душу, так ён мае і свой песенны склад (стыль) твор часьці, найбольш прыдатны да гэтай душы. Ёсьць ён і ў нас, беларусаў. І мы мусім зьвярнуцца да яго, каб улажыць ў нашую паэзію сьвежыя сокі, каб стаць бліжэй да душы роднага народу, лепей паталіць яе духоўную смагу і запраўды ўзяцца за вялікую працу: разьвіцьцё беларускай народнай культуры»,—* пісаў ён у артыкуле «Забыты шлях». І да гэтай тэмы ён зьвяртаўся неаднойчы. Максім апісваў побыт, адзеньне, песенную творчасьць украінскага насельніцтва ў нарысах «Червоная Русь», «Угорская Русь». Зьвяртаўся да этнаграфічнага матэрыялу, працуючы над брашурай «Братья-чэхі», артыкуламі «Беларусы», «Украинское казачество» й іншымі. Яго невялічкія нататкі пра вершы Пушкіна сталі глыбокімі дасьледваньнямі ра сейскага, беларускага, украінскага фальклёру. Наогул, народная творчасьць стала для Максіма ня толькі глебай для натхненьня. Гэта той шлях, які на яго думку, павінен весьці паэтаў да сапраўднай беларускай паэзіі. Беларускай ня толькі па мове, але і па духу. Складанай і няпростай дарогай і пайшоў Максім.

Пасьля расстаньня зь Аняй, яго душа пачала нудзіцца і зьнемагаць. І ў беларускіх песьнях ён, нечакана для сябе, знайшоў аналягічныя думкі і пачуцьці. Іх складаў народ. на працягу тысячагодзьдзяў.

А весткі ад Ані прыходзілі ўсё радзей. Казалі, што яна мела вялікі посьпех як піяністка, што за ёй залятаецца шмат хлапцоў. Максім верыў і не верыў чуткам. Каханьне да Ані было настолькі моцным і чыстым, што ён быў удзячны лёсу нават за тыя кароткія хвіліны яго шчасьця. Пытацца каго-небудзь пра Аню ён ня мог. Яе цётка, якая разумела яго пачуцьці, не хацела, каб пляменьніца, якую яна выхоўвала зь дзяцінства, была разам з Максімам. Жанчына здагадвалася аб хваробе юнака і ведала, што сухоты, ад якіх памерлі яго маці і брат, рана або позна забяруць і яго. Цётка хацела шчасьця сваёй пляменьніцы... Максім адчуваў тую непрыязьнь сэрцам. Ён разумеў, што Тацьцяна Рафаілаўна ніколі не згадзіцца на іх шлюб, і ўсётакі спадзяваўся на лепшае, бо надзея заўсёды памірае апошняй. Кожны вечар Максім выходзіў на набярэжную Волгі, праходзіў тыя мясьціны, якія ён некалі наведвал з Аняй. Над зямлёй узыходзіла яркая зорка Вэнера, якая несла з сабой сьветлыя згадкі.

# ЧАРНОБЫЛЬСКІ ШЛЯХ

# Chernobyl

**Alexander Lyutsko, Ph.D.**

The explosion of Unit 4 of the Chernobyl nuclear power plant happened on the eve of a great holiday, the First of May, which is not only widely celebrated in the Soviet Union, but also an occasion for people to visit friends and relatives.

Although, as it became clear later, the Moscow based authorities (the USSR State Committee for Hydrometeorology, the Institute of Biophysics of the Ministry of Public Health of the USSR, army units, various specialists on nuclear power) immediately carried out measures in the Chernobyl area, but official information to the public at large was withheld. While residents of a 30 km zone from the nuclear power plant were evacuated, no iodine prophylactics or control of contaminated food took place. Because of such negligence, many people located on the track of the radioactive cloud received very high doses early in the accident. Unfortunately, an accurate reconstruction of the radiation levels at that point in time is nearly impossible.

Byelorussian scientists became involved in this case only later. At first only rumors were circulated about an accident at Chernobyl. On May 1, the workers of the Nuclear Department in the Gomel region started to take samples of soil and vegetation. The radioactivity of these samples exceeded several hundred thousand Bks per kg. Moreover, the containers of condensed milk manufactured in the Gomel region have been used as a radioactive source for students' laboratory work.

At first the staff of the Institute of Nuclear Energetics, the Scientific Research Institute of Cancer and Medical Radiology and the University were involved in the problem. The Committee on Reducing the Consequences of Chernobyl, the Department of the Environment Radiation Control as well as the Institute of Radiology and the Agricultural Radiometry Control Service were set up later. Worst of all, there were no experienced specialists and instruments available to monitor the situation. 12 gamma radiometers were quickly produced at the University's Department of Nuclear Physics. While, of course, quite insufficient, these were the only units in the republic at that point.

All information gathered was submitted to a Government Committee, which comprised of completely unqualified agricultural, industrial and economics executives, who ignored all scientific recommendations, viewing the problem from their particular point of interest. They began to erect many settlements for migrants in the highly contaminated areas, as well as the deconta- mination of numerous small towns and villages. We know now that these measures produced very poor results. More than one billion rubles were wasted, without any tangible effects. And, worst of all, agricultural production of foodstuffs continued in the contaminated territory without the benefit of any radiometric control. As a result, radioactivity was dispersed all over Byelorussia, increasing the individual dose all over.

In the meantime, bad news started to arrive from the contaminated area. Daily, more and more people were complaining of weakness, and their health was turning for the worse. Thyroid problems



were increasing radically, especially among children. It can be assumed that in certain cases this was caused by the absence of correct information, and the presence of army troops. It became to be called radiophobia. However, it is necessary to take into account that the individual doses caused by the short-lived radioactivity, especially during the passage of the big radioactive cloud over Byelorussia, reached a very high level indeed. Nobody has yet proven that a high dose of radioactivity is beneficial to human health.

Because of the inadequate amount of measurements at that time we are unable to reconstruct the primary picture of the accident. By that I mean the initial level of radiation. In addition, the then Ministry of Public Health, has refused to admit that radiation could result in any ill-effects on the health of the individuals. Thus some very valuable information concerning the dose-rate in humans at the first stage of an accident like Chernobyl was lost to science forever.

The range of the dose-level still remains the main reason for disagreement between the officialdom in Moscow and the Byelorussian point of view. The methodology worked out by the Moscow Institute of Biophysics takes into account only the doses incurred by *Cs* radiation, ignoring other radio isotopes as well as the doses at the very first stage of the accident. As is widely known, the "350 mzv concept," developed in the Moscow Institute of Biophysics was rejected by the Byelorussian scientific community.

Dose calculation remains a principal and basic problem in the affected regions of Byelorussia. A more accurate definition of doses received by individuals is of particular importance in the objective estimation of the radiation situation in the republic, as well as of great scientific value. Moreover, it is necessary for making necessary decisions in connection with planing as well as safety measures needed.

The contaminated foodstuffs are another problem. These have received a considerable dose of the radiation throughout Byelorussia. No doubt the determination of cesium contamination is the simplest task at hand. This year it was forbidden to produce agricultural goods in the contaminated areas, but produce from private lots are outside of any controls. As before, there is no equipment available to perform on the spot checking of agricultural goods in the markets. Three models of inexpensive gamma radiometers were developed by the Department of Nuclear Physics, and it is hoped that "Radiometer Enterprise" will produce some three to four hundred of them in near future. This would enable authorities to properly manage the cesium problem.

However, for strontium determination the problem is considerably more serious. We have previous information that bones of individuals show a very high strontium content. We believe that the strontium problem will become a critical one, as long as this element is being accumulated and isn't removed.

We would like to underscore that many of us in the scientific community distrust the quality of radiometric determinations made so far. Any reasonable person understands that the results of any determination depends on the accuracy and quality of the instrumentation available. The problem lies therein that the quality of determination is not adequate when considering the scale of the contaminated area.

Another problem we face is the rather wide-

spread radio-ecological ignorance among both the population and the officials. The resources are frequently wasted, including the charitable help from abroad. For example, precision instruments are frequently found in places where there is no qualified personnel to operate them. On the other hand, the people are not capable to apply the simplest individual safety measures. We are certain, had the young recruits who were brought in to Chernobyl to take part in the reactor emergency cleanup, the so called "liquidators," who were, consequently severely exposed to radiation, have known more about radioactivity, they would be in a much better health today than they are. During this year only two popular brochures were published in Byelorussia, one of them a brief pamphlet.

We hope that in near future the Minsk State University will organize a Radio-Ecological College with the aim to serve as an international education center to train technicians, teachers, etc.

The last but not least of the Chernobyl generated problems is an internal one. The reduction of the consequences of the disaster is quite impossible without a proper scientific guidance. Unfortunately, the various institutions involved, as well as the participating scientist act separately, without collaborating with each other. But what we need is unity of purpose, a high level scientific committee that would collaborate with the government, that would make recommendations how to use the resources available in the most effective ways.





# ЗГУКІ БАЦЬКАЎШЧЫНЫ

## Татары на зямлі Беларусі

Сьвятлана Менская

**Восьмы Хадзіс**

*«...Спытаў адзін чалавек Прарока*
*(Міласьць і мір яму ад Бога)*
*—Які Іслам лепш і Прарок адказаў:*
*Карміць тых, хто патрабуе*
*і вітацца (казаць салам) з тымі,*
*каго ведаеш*
*і з тымі, каго не ведаеш...»*

«На зямлі высакароднага, зычлівага і працавітага народу—беларусаў жыве жменька татараў. Іх так мала, што ў звычайных даведніках колькасьць не пазначаецца, бо складае каля 0,12% ад насельніцтва Беларусі. Калі-ж лічыць, колькі засталося нашчадкаў татараў, што пасяліліся на тэрыторыі Вялікага княства Літоўскага ў канцы XIУ ст., то іх яшчэ менш. Прайшло ўжо амаль 600 гадоў, як мы жывем воддаль ад сваёй былой радзімы — Паволжа і Крыма, але мы не выракліся свае веры —Ісламу— і свайго імя. Часам ад паволжскіх або крымскіх татараў можна пачуць папрок, што мы ня ведаем татарскай мовы. Мы карыстаемся ўжо нам роднай беларускай мовай, гаворым на расейскай мове, разумеем польскую, украінскую. А галоўнае, мы выхоўваем сваіх дзяцей сумленнымі і працавітымі грамадзянамі, якія маюць гонар называцца татарамі ў любых абставінах. А што тычыцца татарскай мовы, то прыйдзе час і ў нас будуць свае татарскія школы».

Гэтымі словамі па-беларуску пачынаецца прадмова да «Байрама», часопіса татарскага грамадзка-культурнага аб'яднаньня «Аль-Кітаб» Менскай вобласьці. Яго пачала выдаваць ініцыятыўная група татараў пры Менскім абласным аддзяленьні Фонду культуры. Пра што гэты квартальнік? Пра гісторыю і падзеі, да якіх дачыніліся беларускія татары, пра асновы Ісламу, пра дасьледчыкаў гісторыі і культуры татараў, пра занятки і рамёствы, пра жыцьцё татараў у Татарстане, пра крымскіх, сібірскіх, астраханскіх, літоўскіх і польскіх татараў. Мяркуецца друкаваць слоўнік казанскататарскіх і крымскататарскіх найбольш ужывальных слоў і выразаў.

Першы нумар адкрываецца цікавым матэрыялым пра беларускіх татараў, іх мінулае і сучаснасьць. Зьяўленьне татараў на тэрыторыі Беларусі вучоныя тлумачаць па-рознаму. Але, на думку аўтараў, найбольш пераканальнае меркаваньне прафэсара Пецярбургскага ўнівэрсытэта Антона Мухлінскага. «Татарскае насельніцтва ўзьнікла... з трох элемэнтаў: аселых наёмных і саюзных воінаў татарскіх ордаў; з улусаў, што трапілі ў палон, прыгнаныя Вітаўтам; з выхадцаў Залатой Арды і Крыма, што стаміўшыся ад нязгоды ў сваёй айчызне, самі добраахвотна перасяліліся ў Літву».

Паводля дадзеных гісторыкаў Я.Гембіцкага, З. Капыскага, А, Грыцкевіча, расьсяленьне татараў ў Беларусі пачалося з ХУІ ст. У Менску назва «Татарскі канец» (ускраіна) ў гістарычных дакумэнтах упершыню згадваецца ў 1560 годзе, але пасяленьне татар, відаць, было ў горадзе значна раней. Татарскія вуліцы былі ў Слоніме, Бярозе Бярэсьцейскага павету, Горадне й інш. гарадах Беларусі, што сьведчыць аб цесным засяленьні татарамі Беларускай зямлі. Аб гэтым расказвае артыкул «Унутрыгардскія назвы на Беларусі».

Квартальнік пачаў друкаваць у пера кладзе на беларускую мову Кур'ян Альфаціха. У «Мазаіке тых часоў» расказваецца аб тым, як адбываўся працэс высяленьня татараў з Крыма. Значнае месца адведзена фальклёру татараў. Надрукаваныя старажытная казка з Кітабу, рукапіснага зборніка тэкстаў, запісаных па-беларуску арабскімі літарамі, літаратурная апрацоўка татарскай легенды Вінцуком Адважным. Прыводзяцца тэксты, ноты крымскататрскіх народных песьняў «Что гэта за дзеўчына» і «Перад усходам луны», рэцэпты з татарскай кухні.



Арлен Кашкурэвіч



# Адраджэнцы «Пагоні»

Людміла Налівайка



Пячатка Вітаўта. 1407-1418 гг.

*Пагоня і Адраджэньне — сьвятыя для кожнага беларуса словы. Яны суіснуюць у яго сьвядомасьці заўсёды разам. За свабоду Бацькаўшчыны, за збаўленьне яе ад ворагаў склікалі нашыя князі Пагоню. І яна ратавала зямлю, не давала ёй згінуць. А калі трэба было — адраджала яе з папялішчаў, ратавала ад згубы. Пагоня і Адраджэньне ляцелі ў бязьмежную даль праз стагодзьдзі, зьвязаныя адным ланцугом. Сымбалем кожнага Адраджэньня быў рыцарь, які на грозным кані лунаў над зямлёй Беларускай, ахоўваючы яе межы. І кожны, хто вырашыў сваё жыцьцё прысьвяціць Адраджэньню Бацькаўшчыны, прысягаў на Пагоню, каб «... из с тою потребою отчизны, если она да конца згинет, з нею згинуть, або если через ваш ретунок будет выдвигнена, з вами и з нею вы-бринуть».*

*Быць можа таму, «Адраджэньнем» назвалі сваю выстаўку мастакі суполкі «Пагоня», якая экспанавалася сёлета ў Менску, у залях Палаца мастацтва. Яна была створана з удзелам БНФ, Беларускага фонду культуры і стала першай выстаўкай сябраў гэтага маладога аб'яднананьня.*

*Выстаўка паказала (з пункту гледжаньня гісторыі) ня толькі адзін з шляхоў разьвіцьця мастацтва Беларусі, але і падвяла вынікі працы мастакоў-асьветнікаў за шмат гадоў іх творчай дзейнасьці ў гэтым напрамку.*

*У Беларусі добра ведаюць іх імёны. А. Марачкін, П. Драчоў, Я.Кулік, М.Купава, У Маркавец, Ю. Герасіменка-Жызьнеўскі, А.Лось, А. Сьвістуновіч, У Крукоўскі, Ю. Піскун, У Сулкоўскі, М.Назарчук, Л. Кальмаева, Я. Батальёнк, А. Шатэрнік, А.Пашкевіч, Г.Скрыпнічэнка, А. Лапіцкая, В.Мікіта, К. Харшэвіч, У.Хадаровіч, А.Цыркуноў і інш., хто на працягу многіх гадоў адстойваў у сваёй творчасьці права на адлюстраваньне былога і цяперашняга зь гісторыі і быту Беларусі.* На сёньняшні дзень гэтыя мастакі — авангард беларускага нацыянальнага мастацтва. Яго гонар і яго адраджэньне. З творчасьцю некаторых зь іх і знаёміць чытачоў часопіса «Полацак» Людміла Налівайка.



Сучасная выява Пагоні

Нягледзячы на тое, што сябры «Пагоні» не ставілі перад сабой задачы прытрымлівацца якога-небудзь аднаго творчага стылю, але ўсе яны працуюць у рэалістычным напрамку, распрацоўваючы клясічныя прынцыпы і традыцыі мастацтва беларускай, расейскай і заходніх школаў. У арсэнале мастацкіх сродкаў уключаюцца розныя манэры і спробы — калаж, мантажы, імпрэсіяністычныя прыёмы, сродкі фотарэалізму.

Не сёньня пачалася дзейнасьць вядомага беларускага мастака Я.Куліка — аўтара графічных твораў, якія ўзнаўляюць гістарычную карціну разьвіцьця Беларусі, пачынаючы ад старажытных часоў. У сваёй экспазыцыі мастак дэманстраваў графічныя партрэты Рагвалода, Тура, Рагнеды, Ізяслава, замкі Беларусі.

А.Марачкін — мастак летуценьнік, праўдашукальнік. На працягу многіх гадоў мастак, падобна «дзядзьку Язэпу Драздовічу», абыйшоў пешшу шмат якія вёскі Меншчыны, Віцебшчыны, Полаччыны. Ён замалёўваў гістарычныя мясьціны, зьбіраў цудоўныя ўзоры народнага мастацтва. Разам з сваімі паплечнікамі вярнуў жыцьцё творам Я.Драздовіча, А. Кіш. Любоў да гісторыі свайго народу дапамагае Ал. Марачкіну ў яго нялёгкай працы па выхаваньню маладых мастакоў. Ён —выкладчык жывапісу ў Беларускім тэатральна-мастацкім інстытуце. На выстаўцы мастак прадэманстраваў свае адносіны да мінулых і адначасова сучасных праблемаў. «Сьцежкамі Я.Драздовіча», «Зьніч», «Памяці Палын» «Планета Палын» «Памяці 26 красавіка 1986 года»,— на гэтых і іншых яго творах можна пабачыць вобразы сёняшніх барацьбітоў за адраджэньне беларускай мовы, нацыянальнай годнасьці народу: Я.Луцэвіча, З.Пазьняка, А.Бембеля й іншых змагароў зямлі Беларускай.

Творы плякатыста У Крукоўскага — аўтара шэрагу аркушаў, прысьвечаных Я.Драздовічу, М. Багдановічу, К.Каліноўскаму, У. Караткевічу добра вядомы беларускім гледачам. Яго плякаты захапляюць сваёй выразчасьцю колераў, лаканізмам адлюстраваньня і ўнутранай цеплынёй вобразаў. (Часопіс «Полацак» знаёміў сваіх чытачоў з творчасьцю У.Крукоўскага на прыкладзе пляката «У бітвах за волю, у бітвах за волю» (Гл. « Полацак» № 1).

У зусім іншай манэры працуе Л. Кальмаева. На гэты раз яе плякаты прадстаўлялі сэрыю з саломкі на тэму беларускіх народных танцавальных ансамбляў, тэатральных студыяў і г.д. Сінтэзацыя сродкаў і прыёмаў выяўленьня плякатна-графічнага мастацтва прыкмет на перабудавалі характар кампазыцыйнага мысьленьня Кальмаевай — мастачкі высокага клясу, выхаваццеля новага пакаленьня беларускіх плякатыстаў.

А.Лапіцкая — вядомая графік —ілюстратар. З ранейшых выставак гледачу знаёмы партрэт М.Багдановіча, які быў прадстаўлены і на гэты раз. Новыя творы мастачкі — ілюстрацыі да часопіса «Веснік Беларускага Экзархата» (1990), дзе асабліва прыцягвае ўвагу малюнак зь выяваю Ісуса Хрыста «Прыйдзіце да мяне...»

В.Мікіта — аўтар ілюстрацыі казкі У. Караткевіча «Чортаў скарб» і кнігі вершаў «Мая Іліяда», якія зьвяртуюць на сябе ўвагу распрацаванасьцю і глыбінёй ідэі. Творы У.Караткевіча ўжо доўгі час ілюструе яго паплечнік, сябра П.Драчоў. І на гэты раз мастак паказаў сэрыю малюнкаў аб старажытнай Беларусі, яе замках, гістарычных асобах, падзеях. Маляўнічыя аркушы казачніцы-мастачкі А.Лось выхоўваюць дзетак, каб яны былі добразычлівыя, любілі прыроду. Выхоўваць любоў да радзімы з маленства —



вось асноўная задача мастачкі.

Мастак-вучоны Ю.Піскун прадставіў сэрыю твораў жывапісу на тэму быта беларускага народу, яго традыцый, жыцьця. «Вясельле ў Беражцах», «Ратуціцкія хлопцы», «Сырадой» «Алена» — усе творы сьведчаць аб майстэрстве і працавітасьці мастака, які шмат гадоў аддае свой талент тэме простай - навакольнае жыцьцё вёскі, яе людзі. Добрае веданьне этнаграфіі, традыцыяў беларускага народнага мастацтва іканаграфіі (Ю.Піскун дасьледчык старажытнабеларускай іканаграфіі), без сумненьня, накіроўваюць маладога мастака і дапамагаюць пісаць зь любоўю і пяшчотай.

Жывапісцы, майстры пэйзажу і партрэта К.Харашэвіч, Я.Батальёнак, М.Назарчук, У Сулкоўскі, У Хадаровіч, кожны прысягае ў любові і вернасьці свайму шляху, сваёй радзіме. Кожны зь іх пасвойму размаўляе з гледачом аб прыгажосьці лясоў і гаёў, сонечным сьвятле і зорах. Маладэчанскі жывапісец з паэтычным дарам К.Харашэвіч называе свае творы проста: «Краявід з дарогай», «Стары двор», «Радзіма Цёткі», «Залесьсе. Памяці Агінскага».. Але мастак ня проста адлюстроўвае краявіды, кожны з гэтых твораў — невялікія паэма аб прыгажосьці, што ўздымае эмацыянальныя пачуцьці да Бацькаўшчыны, якая прадстаўляецца то ў вячэрніх прыцемках, то ў манумэнтальных начных прывідах-мурах.

«Казачныя шляхі» вядуць да Я. Батальёнка. Як вершы, кладуцца на аркуш невялікія пэйзажы з выявамі палеткаў, лесу, сонца. Мастак Батальёнак —лірык. Ён прыслухоўваецца да прыроды і раіць нам зрабіць тое-ж самое. Нават постаці працаўнікоў зямлі ў яго выглядаюць неяк сьветла. Яны як-бы злучаюцца з прыродай, ствараюць зь ёю адзіны сьвет, дзе ёсьць і «Адвечная цішыня», і сьвятыя «Крыж Еўфрасіньні Полацкай». «Дзе сонтрава» і дзе сьпяць «Курапаты». Мастак кажа нам: ўсё, што ёсьць на нашай зямлі — гэта адвечаня песьня аб шчасьці, волі і спакою.

Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва «Адраджэньня» было прастаўлена шыкоўнымі касьцюмамі з старажытных эпох. Мастак габеленшчык А.Сьвістуновіч як і заўсёды, прытрымліваючыся тэмы гістарычнага мінулага, прадставіў габелен «Еўфрасіньня Полацкая». Легендарная птушка, нібы лунае на паверхні нашай зямлі і не можа апусьціцца. Другі габелен «Пагоня» (лён, ткацтва) распрацаваны, нібы карціна з каштоўных камянёў,

Быццам-бы своеасаблівым каменным поясам «Адраджэньне» ўпрыгожвалі скульптуры А.Шатэрніка. Розныя матэрыялы, але адзіная рука майстра дазволілі скласьці летапіс з партрэтаў Кірылы Тураўскага, Вітаўта, Сімяона Полацкага, Янкі Купалы, Уладзіміра Караткевіча, Летапісца й іншых вядомых асобаў Беларусі. Дапаўняюць гэтую сэрыю жывапісныя творы В. Камарова «Еўфрасіньня Полацкая», «Ф.Скарына»; «Сімяон Полацкі М.Маеўскага, «Прысьвячаецца К.Каліноўскаму». Мастакі М. і Г.Сакаловы-Кубаі дасьледуюць шлях Скарыны. Іх паліптых «Скарына» (5 частак) расказавае аб шляхах паважанага беларускага вучонага ў Падую, Кракаў, Вільню, Прагу.

Заклапочаннасьць лёсам Бацькаўшчыны, імкненьне працаваць дзеля дзяржаўнасьці, нацыянальнага, духоўнага і культурнага адраджэньня Беларусі дае падставу лічыць «адраджэнцаў» мастакамі-выхавацелямі, асьветнікамі, якія сваёй працай дапамагаюць лепш зразумець сваю Бацькаўшчыну, сваё Адраджэньне і Пагоню.

# ЗЬ ЖЫЦЬЦЯ ЭМІГРАЦЫІ

## 24 Кангрэс БАЗА

адбыўся 14 і 15 верасьня у Гайленд-Парку, штат Нью-Джэрсі. Упершыню на ім присутнічалі госьці з Бацькаўшчыны: дэпутат Вярхоўнага Савета Беларусі Ўладзімір Новік і заступнік мэра г.Менска Анатоль Гурыновіч. Галоўнымі пытаньнямі Кангрэсу сталі справаздачы ўступаючай Галоўнай Управы, аддзелаў БАЗА, газэты «Беларус», выбары новае Галоўнае Ўправы і рэвізыйнае камісіі, складаньне пляна на будучыню.

У сваёй справаздачы старшыня БАЗА А. Шукелойц падкрэсьліў, што тая праца, якая рабілася на працягу многіх гадоў Управай БАЗА, дала свае вынікі. Арганізацыя моладзі працягвае традыцыі БАЗА, пераймае вопыт. З часам, калі ў Беларусі пачнецца новы пэрыяд станаўленьня незалежнасьці, роля эміграцыі зьменіцца. Яна стане большай помаччу Беларусі ў ейным адраджэньні.

Ад Нью-Йоркскага аддзелу БАЗА выступіў яго старшыня Аляксандр Міцкевіч. Ён адзначыў, што аддзел БАЗА, у якім зараз налічваецца 65 сяброў, браў удзел у сьвяткаваньні Слуцкага Паўстаньня, 25 Сакавіка, XIX сустрэчы Беларусаў Паўночнай Амэрыкі. Арганізаваў латэрэю, спатканьне з лідэрамі БНФ, сустрэчу з рэжысёркай В.Вярбоўскай, рабіў прыняцьцё для Данчыка. Сіламі аддзелу выдаецца бюлетэнь «Весткі й паведамленьні аддзелу БАЗА» і распаўсюджваецца газэта «Беларус».

Старшыня Клііўлендзкага аддзелу БАЗА Янка Ханенка прыпыніўся толькі на асноўных момантах той працы, якая была праведзена аддзелам за апошнія два гады. Гэта, па-першае, арганізацыя XIX сустрэчы Беларусаў Паўночнай Амэрыкі, закладка фонду сустрэчы — 12 тысяч даляраў, адзначэньне 25 Сакавіка і 100-годзьдзя нараджэньня Максіма Багдановіча. Па-другое, аддзел БАЗА садзейнічаў прыезду на адпачынак у ЗША групы дзяцей з Гомельскай вобласці, рабіў прыняцьцё для лідэраў БНФ Пазьняка, Заблоцкага, Баршчэўскага, правёў зборку грошаў для БНФ (Усяго было перададзена ад аддзелу БАЗА, царкоўнага і жаночага камітэтаў 15 тысяч даляраў). Аддзел арганізаваў прыезд у Кліўленд дэлегацыі сацыяльна-эканамічнага саюза Чарнобыль у складзе Васіля Якавенкі, Аляксандра Люцко, Анатоля Белага. Спрыніўся у выданьні часопіса «Полацак».

Ад Нью-Брансьвіцкага аддзелу выступіў старшыня Янка Азарка. Ён адзначыў, што аддзел прымаў удзел у XIX сустрэчы, ахвяраваў на паездку танцавальнага ансамбля «Васілёк» у Беласточчыну 300 даляраў, зладзіў акадэмію ўшанаваньня памяці Кастуся Каліноўскага ( да 150- годзьдзя з дня нараджэньня), вітаў лідэраў БНФ. Юрка Азарка зладзіў спатканьне дэпутатаў з кангрэсмэнам Рычардам Зымэрам.

Ад імя аддзелу БАЗА у Каліфорніі выступіў рэдактар газэты «Byelorussian reviw» Я.Арцюх. Ён расказаў аб выданьні газэты, якая пачала выходзіць з 1987 г.

Справаздачу ад газэты «Беларус» зрабіў Янка Запруднік. Ён адзначыў, што 30 экзэмпляраў газэты перасылаецца на Беласточчыну, а 50 у Беларусь. З зьменай сытуацыі на Бацькаўшчыне, роля газэты не паслабляецца, а наадварот ўзмацьняецца. Фінансавую справаздачу газэты зачытала Раіса Станкевіч.

З дакладам «Роля Беларускай эміграцыі у станаўленьні незалежнасьці Беларусі» выступіў ад імя апазыцыі БНФ у Вярхоўным Савеце Ўладзімір Новік.

—У сувязі зь імклівымі працэсамі нацыянальна дзяржаўных пераўтварэньняў у СССР, — падкрэсьліў дэпутат,— якія вядуць да ўзьнікненьня на руінах былой Расейскай імпэрыі шэрагу незалежных дзяржаваў, вялікую ролю можа адыграць ва ўстанаўленьні і незалежнасьці гэтых дзяржаваў нацыянальная эміграцыя. Гэта ў першую



чаргу датычыцца наладжваньня кантактаў паміж беларускімі й амэрыканскімі фірмамі, установамі, арганізацыямі і банкамі.

Нягледзячы на тое, што сёньня беларуская эміграцыя ў ЗША значна пасталела, а моладзь пачынае асыміляваць, тым ня менш нават першае знаёмства зь беларусамі ў Амэрыцы дае падставы спадзявацца на магчымасьць плённага ўдзелу беларускай эміграцыі ў працэсе станаўленьня незалежнасьці і дзяржаўнасьці Беларусі.

Аналіз Беларускай эміграцыі ў Амэрыцы паказвае, што ў сваёй большасьці яна ўяўляе сабой генэтычна здаровую, працалюбівую частку беларускага этнасу, якая здолела ў складанейшых умовах чужыны, без усялякай падтрымкі звонку, выжыць у Амэрыцы і заняць пачэснае месца ў амэрыканскім грамадзтве.

Якую-ж ролю ва ўстанаўленьні незалежнасьці Бацькаўшчыны можа адыграць беларуская эміграцыя ў Амэрыцы? У сувязі зь узьнікненьнем у апошнім часе новых грамадзка-палітычных і эканамічных абставін у Беларусі — вельмі вялікую. Кансалідацыя дэмакратычных сілаў у СССР і пазыцыя дэмакратычных дзяржаваў сьвету прывялі да абвяшчэньня палітычнай і эканамічнай незалежнасьці Беларусі. Але ад абвяшчэньня да дасягненьня рэальнай незалежнасьці Беларусі патрэбна прайсьці складаны шлях.

Уладзімір Новік адзначыў, што для Бацькаўшчыны зараз ад эміграцыі патрэбная наступная дапамога:

—Наладжваньне дзелавых кантактаў паміж беларускімі і амэрыканскімі арганізацыямі, установамі і банкамі;

—Арганізацыя навучаньня беларускіх бізнесмэнаў ў ЗША;

—Навучаньне беларускіх бізнесмэнаў у Беларусі;

—Аказаньне пасрэдніцкіх паслуг пры наладжваньні дзелавых кантактаў паміж беларускімі й амэрыканскімі бізнесмэнамі;

—Стварэньне інфарматыўных бюро.

Аб стварэньні інфармацыйнага банка гаварыў на Кангрэсе Янка Запруднік. Ён прапанаваў стварыць банк дадзеных на ўсіх беларусаў ЗША. Гэтая прапанова і лягла ў аснову плянаў на будучыню. Янка Ханенка прапанаў Галоўнай Управе БАЗА зьвярнуцца у афіцыйныя колы Вашынгтона, для устанаўленьня квоты для эмігрантаў зь Беларусі. На завяршэньні першага дня працы Кангрэса была адзінагалосна выбрана Галоўная Ўправа у складзе: А. Шукелойц — старшыня, Ю.Азарка, Ф.Бартуль —заступнікі, В.Русак — сакратар, А. Орса-Рамана — культ.рэфэрэнт, Я.Запруднік —рэфэрэнт прэсы й інш. публікацыяў, Р.Станкевіч —вонкавыя дачыненьні, Ю.Кіпель — рэфэрэнт адмысловых праектаў, А.Міцкевіч — сябра, В.Тур — каардынатар ад Моладзі. Таксама прынята рэзалюцыя 24 Кангрэса, абмеркаваны іншыя пытаньні.

На наступны дзень пасьля сьв. Літургіі і благаславеньня а.Васілём Адрэюком адбыўся банкет, пад час якога было выказана шмат цікавых думак і прапаноў. Госьці банкету Валянтына Пархоменка й Алесь Казак прасьпявалі некалькі беларускіх песьняў.

## Гадавы сход Кліўлендзкага аддзелу БАЗА

адбыўся 29 верасьня на Полацку. Што было зроблена за гэты час, якія задачы стаяць перад аддзелам зараз, калі Беларусь абвясьціла сваю незалежнасьць, — аб гэтым гаварыў старшыня Янка Ханенка. Ён адзначыў, што мінулы год быў памятны перш за ўсё сваімі гасьцямі. Гэта госьці XIX сустрэчы Беларусаў Паўночнай Амэрыкі і прадстаўнікі розных арганізацый, якія на працягу года наведвалі Кліўленд. Сярод іх лідэры БНФ Зянон Пазьняк, Лявон Баршчэўскі, Уладзімір Заблоцкі, дэлегацыя сацыяльна-экалягічнага саюза «Чарнобыль» у складзе Васіля Якавенкі, Аляксандра Люцко, Анатоля Белага, дэпутат Вярхоўнага Савета Беларусі Ўладзімір Новік, намесьнік мэра г.Менска Анатоль Гурыновіч, фотакарэспандэнт Анатоль Кляшчук, археоляг Сяргей Тарасаў. Аддзел заапекаваўся падарожжам з Вашынгтона ў Піцбург групы дзяцей, якія прыляцелі на адпачынак з Гомельшчыны; ладзіў нацыянальныя беларускія сьвяты і акадэмію ў гонар Максіма Багдановіча; прымаў удзел ў палітычным жыцьці Амэрыкі: праводзіў кампанію падтрымкі кандыдата на пост губэрнатара штата Агаё Дж. Вайновіча, прысутнічаў на інагурацыі губэрнатара ў сталіцы штата Каломбусе.

—Зараз, — падкрэсьліў Янка Ханенка, — мы зможам больш актыўна праводзіць сваю лінію. Але нам патрэбен прыток эміграцыі, маладых, здольных людзей, якія змаглі-б нешта зрабіць для нашай арганізацыі і самі навучыцца ў нас.

Прамоўца прапанаваў унесьці ў рэзалюцыі сходу, пункт аб тым, каб Галоўная Ўправа БАЗА зьвярнулася ў Вашынгтон з просьбай аб квоце для эмігрантаў зь Беларусі.

Сход выбраў управу аддзелу. У яе вайшлі Янка Ханенка — старшыня, Андрэй Стрэчань — заступнік, Лідзія Лазар-Ханенка, сакратар, Астап Яраховіч — скарбнік, сябры: Янка Раковіч, Валя Гарох, Маруся Каваленка. У рэвізыйную камісію ўвайшлі: Іван Каваленка, Сяргей Карніловіч, Ірына Каляда.

## Стагодзьдзе Максіма Багдановіча

рыхтуюцца урачыста адзначыць беларусы Чыкага. Яны не засталіся раўнадушны да лёсу помніка славутаму паэту ў Яраслаўлі, горадзе, у якім наш зямляк правёў сваю маладосць. На заклік менскага клюба «Спадчына» яны сабралі 505 даляраў, якія даслалі ў рэдакцыю часопіса «Полацак». Ахвяры склалі: Ніна і Павел Агалец, Мікалай Валатоўскі, Кастусь Загонек, Іван Кравчук, а. Міраслаў Кулік, Міхась Каленік, Мікалай Латушкін, Яўхен Макарэвіч, Уладзімір Маркоўскі, Пётр Нягода, Аляксандр Сутынец, Валянтына Талочка, Даніла Швефель, Фёдар Якіменка. Усім ім клуб «Спадчына» выражае вялікую падзяку і шле свае найлепшыя прывітаньні і зычэньні з нагоды акадэміі, прысьвечанай юбілею Максіма Багдановіча. Акадэмія адбудзецца 20 кастрычніка ў залі Беларуска-Амэрыканскай праваслаўнай царквы «Сьв.Юрыя» пасьля сьв. Літургіі. Даклад пра жыцьцё і творчасьць паэта прачытае заступнік Старшыні Беларуска—Амэрыканскай праваслаўнай царквы «Сьв. Юрыя» Мікалай Латушкін.





*1928 г. на беразе р. Палаты ў падэшвы Полацкага гарадзішча.*
*Справа мыс (Стрэлка) Ніжняга замку.*
*А. Ляўданскі, С. Дубінскі сярод полацкіх краязнаўцаў.*
*Зьлева на другім пляне прадградзьдзе Полацка VIII —IX стст.*
*Далей чырвоны мост праз Палату.*
*Друкуецца ўпершыню.*